Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
ליאָזאַרישע פון אַלע לענדער, פאַרייניקט זיך!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączte się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

15-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА

ЧАЦЬВЕР
28 студзеня 1932 г.
№ 22 (3411)

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ:

XIV зьезд камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі. Справаздача ЦК КП(б)Б, даклад т. Шаранговіча.
Прывітаньні ад XIV зьезду КП(б)Б (3-я старонка).
Пастанова бюро ЦК КП(б)Б абходзе ільназагатовак (4 стар.).
Брыгневіч. Школа на ўздыме.
Партарганізацыі васьмі адстаючых раёнаў абавязаны ўзьняць уверх крыву лёназагатовак.
50 проц. квартальнага пляну да XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі. (3-я старонка).
За мяжой. Парафіраваньне Савецка-Польскага дагавору аб ненападзе. Інтэрв'ю Народнага Камісара Замежных Спраў т. Літвінава. (4-я стар.).

Гор. Харкаў М. А. Скрыпніку

Прэзыдыум ЦВК БССР вітае Вас, Мікалай Аляксеевіч, з Вашым 60 гадовым юбілеем. Адзначае ў Вашай асобе выпрабаванага, старога бальшавіка—ленінца, барацьбіта за сацыялізм, за генэральную лінію партыі, вялікую Вашу ролю ў справе практычнага вырашэньня напытаньня ў СССР, стойкага барацьбіта з правымі і „левымі" ухіламі. Прэзыдыум ЦВК БССР жадае Вам многіх год жыцьця і работы.

Старшыня ЦВК БССР А. ЧАРВЯКОЎ.
Сакратар ЦВК БССР ГНІЛЯКЕВІЧ.

XIV ЗЬЕЗД КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (БАЛЬШАВІКОЎ) БЕЛАРУСІ

Справаздача Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б

Даклад сакратара ЦК КП(б)Б тав. ШАРАНГОВІЧА

I. Крызіс сусьветнага капіталізму і рост сацыялізму ў СССР

Таварышы! XIV зьезд бальшавікоў Беларусі падагульніць вынікі работы і барацьбы КП(б)Б за генэральную лінію партыі за час, які прайшоў з мінулага XIII зьезду КП(б)Б. Зьезд адчасова вызначыць праграму далейшага, чыгэ больш пасьпяховага працоўваньня наперад па шляху сацыялізму і канкрэтныя шляхі ажыцьцяўленьня гаспадарча-палітычных задач, які стаяць перад партыяй.

Необходна, падагульваючы вынікі салёй работы, спыніцца на становішчы капіталістычных краін на сёньняшні дзень.

Правадыр нашай партыі тав. Сталін на XVI зьезьдзе УсеКП(б) у палітсправаздачы ЦК падкрэсьліў, што сусьветны капіталізм знаходзіцца на шляху далейшага паглыбленьня і абвастрэньня эканамічнага крызісу. «У нас у СССР,—гаварыў т. Сталін,—узрастаючы ўздым сацыялістычнага будаўніцтва і ў прамысловасьці і ў сельскай гаспадарцы. У іх, у капіталістаў—узрастаючы крызіс эканомікі і ў прамысловасьці і ў сельскай гаспадарцы».

Сёньняшнее становішча СССР і становішча сусьветнага капіталізму з вынікчнай сілай пацьвердзілі гэтыя словы тав. Сталіна. Эканамічны крызіс у краінах капіталу, дасягнуўшы гігантскіх разьмераў, штумольна расьце і паглыбляецца з дня на дзень. Тав. Молатаў у сваёй прамове на II сэсіі, ЦВК СССР падаў яркія лічбы вялізарнага паглыбленьня эканамічнага крызісу сусьветнага капіталізму, узятыя з часопісі нямецкага інстытуту кан'юнктурных досьледаў. «З 39 краін,—гаворыцца ў гэтай часопісі, — на якія прыпадае больш паловы сусьветнага гандлю, 54 проц. ахоплены крызісам або непасрэдна стаяць перад яго пагрозай. Пад уплывам гэтага крызіснага абвастрэньня ў крэдытнай сфэры сусьветный кан'юнктуры ўпадак зноў за апошні час абвастрыўся. Індэкс сусьветнай прамысловай прадукцыі, калі ўзяць 1928 г. за 100, упаў з 88 проц. у чэрвені да 73 проц. у кастрычніку».

Асабліва характэрныя факты падае гэта часопіс у адносінах эканамічнага разьвіцьця Германіі ў 1931 годзе. Прамысловая прадукцыя Германіі ў цяперашні момант упала да ўзроўню 1890 году, г. зн. адкацілася на 40 год назад. Цяжкая індустрыя ўпала з 59 проц. у 1929 г. да 49 проц. у 1931 г. Нацыянальны даход Германіі ўпаў з 75 млрд. марак да 55 млрд. у мінулым годзе.

Можна падаць яшчэ цэлы рад краснамоўных фактаў аб найвялікшым паглыбленьні і абвастрэньні эканамічнага крызісу ў Англіі, Амэрыцы, Францыі, калёніяльных краінах, а таксама асабліва ў Польшчы і Заходняй Беларусі, дзе гэты крызіс набыў яшчэ большую сілу, дзе гэты крызіс прывёў да абсалютнага ўпадку (я маю на ўвазе Польшчу і Зах. Беларусь) асноўных галін прамысловасьці, а таксама і ў сельскай гаспадарцы.

У краінах капіталу з катастрафічнай сілай расьце армія галодных, пазбаўленых працы рабочых. Зараз за ўсіх капіталістычных дзяржавах нагінаецца да 40 млн. беспрацоўных. Ідзе шалёнае наступленьне буржуазіі на зарплату працоўных, на сацыяльнае страхаваньне, на матар'яльна-бытавое становішча рабочай клясы і ўсіх працоўных мас.

Адначасова расьце рэвалюцыйны ўздым пралетарыяту ў капіталістычных краінах. Асабліва вялікі рост рэвалюцыйнай актыўнасьці пралетарыяту і працоўных мас, пад кіраўніцтвам нашых брацтваў камуністычных партый і Камінтэрну, мы маем у такіх краінах, як Польшча, Германія, Англія і Амэрыка, дзе гэты магутны ўздым рэвалюцыйнага руху праходзіць на ўмовах шчэрвага тэрору і зьвярыных рэпрэсій з боку буржуазіі і яе сацыял-фашысцкіх служак. Рэвалюцыйны ўздым рабочай клясы ў капіталістычных краінах пераходзіць у арганізаваныя эканамічныя баі пралетарыяту, якія часамі перарастаюць у палітычныя баі. Сусьветны пралетарыят пераходзіць у контрнаступленьне супроць буржуазіі, супроць фашызму і супроць сацыял-фашыстаў. Гэтыя выступленьні ў цэлым радзе выпадкаў перарастаюць у непасрэдныя ўзброеныя баі з паліцыяй і фашыстамі. Да рэвалюцыйнага руху пралетарыяту далучаюцца ўсё новыя і новыя масы працоўнага сялянства, якія пад кіраўніцтвам камуністычных партый і рабочай клясы выступаюць супроць капіталізму.

Як ніколі абвастрыліся і вяўчэльна паглыбляюцца ўнутраныя супярэчнасьці памёж пасобнымі капіталістычнымі дзяржавамі. Сусьветны эканамічны крызіс выклікае абвастрэньне барацьбы за новыя рынкі, асабліва паміж тымі вялікімі краінамі-пераможцамі—Англіяй, Францыяй, Амэрыкай і інш. Абвастрэньні да найвышэйшага пункту ўсе супярэчнасьці, закладзеныя ў Версальскай сыстэме і зьявяныя з пытаньнем аб рэпарацыях. Гэтае абвастрэньне ўнутраных супярэчнасьцяў памёж пасобнымі капіталістычнымі дзяржавамі часамі пераходзіць у адкрытую ўзброеную барацьбу, што зазнала сваё, найбольш яркае адлюстраваньне ў падзеях, якія адбываюцца на Далёкім Усходзе. Сусьветны эканамічны крызіс і зьвязанае з ім рэзкае абвастрэньне супярэчнасьцяй капіталізму выклікае рост інтэрвэнцыянісцкіх імкненьняў міжнароднага імпэрыялізму, накіраваных у першую чаргу, супроць краіны пралетарскай дыктатуры—Савецкага Саюзу. Сусьветны капіталізм шалёна рыхтуецца да новай імпэрыялістычнай сайны.

Працэсы прамсрты і меншавікоўшкодніцтва ў усёй сілай выкрыцьця падрыхтоўку да імпэрыялістычнай супроць СССР, на чале якой (падрыхтоўкі) стаяў французкі імпэрыялізм. Вайна ў Манчжурыі — гэта таксама непасрэдная падрыхтоўка сусьветнага імпэрыялізму да сакрыцкай антысавецкай вайны.

Буржуазія дасканала разумее, што гістарычныя перамогі сацыялізму ў краіне Саветаў усё больш і больш наглядна паказваюць пралетарыяту і ўсім працоўным капіталістычных краін, што адзіным выхадам для іх зьяўляецца той зьлад, які быў ужыты пралетарыятам СССР пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі. Сусьветны эканамічны крызіс, які расьце і паглыбляецца на фоне найвялікшых посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР, прымушае буржуазію шукаць выратаваньня ў падрыхтоўцы новых войн і ў першую чаргу ў вайне супроць СССР.

Што ў зьвязку з гэтым ад нас патрабуецца?

Перш за ўсё ад нас патрабуецца, каб мы і надалей, няўхільна ажыцьцяўляючы генэральную лінію нашай партыі, вядучы рашучую барацьбу з клясавым зорагам і яго агентурай унутры партыі — правымі і «левымі» апартуністамі,—узмацнілі рост гаспадарчай магутнасьці нашай краіны.

Таварышы, за той перыяд, які прайшоў ад XIII да XIV зьезду КП(б)Б, у нашай краіне адбыліся найвялікшыя сацыяльна-эканамічныя зрухі. Досьць спасылацца на апублікаваны ў нашых газэтах дакумант—тэзісы да другой пяцігодкі, якія ў першай сваёй частцы даюць сьцісłую і яркую ацэнку гэтых гістарычных зрухаў. Краіна пралетарскай дыктатуры, пад кіраўніцтвам партыі, канчаткова вырашыла ленінскае пытаньне «хто-каго» і ў прамысловасьці і ў сельскай гаспадарцы на карысьць сацыялізму. У трэцім рашаючым годзе пяцігодкі пераможна пабудован фундамант сацыялістычнай эканомікі. Наша краіна на асноове разгорнутага будаўніцтва саўгасаў і калгасаў, на аснове машынізацыі сельскай гаспадаркі стала краінай самага буйнога земляробства ва ўсім сьвеце. Калгасы і саўгасы заняілі вядучае месца ў сельска-гаспадарчай эканоміцы.

Усё гэта сьведчыць аб нігаўцкім умацаваньні нашай эканамічнай магутнасьці, аб тым, што мы з посьпехам ажыцьцяўляем на справе лёзунг—«дагнаць і перагнаць». Разам з тым гэта зьявілася найлепшым сродкам умацаваньня абароназдольнасьці нашай краіны.

Таварышы, было-б аднак памылковым лічыць, што можна ўмацоўваць абароназдольнасьць нашай краіны, не ўмацоўваючы баяздольнасьці нашай Чырвонай армії. Наша партыя і пад яе кіраўніцтвам пралетарыят і працоўнае сялянства ўвесь час аддавалі вялікую ўвагу ўмацаваньню абароназдольнасьці Чырвонай армії. На даным этапе, калі як ніколі ўзрасла пагроза ваеннай небясьпекі, гэта задача набывае асабліва важнае значэньне.

На падставе посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва мы адначасова здолелі ўзмацніць абароназдольнасьць нашай краіны і Чырвонай армії.

Вырас і падняўся на яшчэ больш высокую ступень палітычны ўзровень байцоў. Слова нашай Чырвонай армії—у яе клясавай сьвядомасьці, у тым, што яна цьвёрда ведае свае мэты і задачы, што наша Чырвоная армія даскана разуеме ўсю адказнасьць сваёй ролі, як вартавога сацыялістычнай будоўлі. Значна вырас і ўмацаваўся палітычны ўзровень каманднага складу нашай Чырвонай армії. У новых умовах, у новай абстаноўцы сацыялістычнага будаўніцтва перад усімі камандзірамі, палітработнікамі і байцамі стаіць задача яшчэ больш узьняць баяздольнасьць Чырвонай армії, узмацніць яе маналітнасьць і згуртаванасьць.

Перад намі, перад усёй КП(б)Б, якая працуе па ўмовах прымежнай рэспублікі, ва ўсю вышыню стаіць задача—аддаваць яшчэ большую ўвагу, чым гэта рабілася да сёньняшняга дня, ажыцьцяўленьню дырэктыў партыі аб умацаваньні баяздольнасьці нашай Чырвонай армії.

Я думаю, што таварышы, якія будуць выступаць па справаздачы ЦК КП(б)Б, падкрэсьляць рад дадатковых пытаньняў і адзначаць нашы недахопы ў гэтай рабоце, каб у далейшым мы з яшчэ большым посьпехам ажыцьцяўлялі задачу ўмацаваньня абароназдольнасьці нашай краіны, умацаваньня нашай Чырвонай армії.

Вось сьцісłы малюнак таго становішча, якое мы маем у капіталістычных краінах і ў нас, у краіне пралетарскай дыктатуры.

Перад намі, перад усёй партыяй і яе верным атрадам КП(б)Б стаяць тэмпаючыя задачы барацьбы за выкананьне пяцігодкі, за ажыцьцяўленьне праграмы чацьвёртага заключнага году, пляну вялікіх работ на аснове рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна.

Які шлях нашага далейшага разьвіцьця? Я думаю, што гэты шлях з выключнай яснасьцю адлюстраваны ў тэзісах дакладаў т.т. Молатава і Куйбышава на XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі. Гэта ёсьць дакумант най вялікшага сусьветна-гістарычнага значэньня. Гэта разгорнутая праграма на шага далейшага працоўваньня наперад пад сьцягам ленінізму па шляху да бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва. Я павінен падаць некаторыя важнейшыя пункты з гэтага дакумэнту, якія маюць асабліва значэньне.

«XVII канфэрэнцыя УсеКП(б),—гаворыцца ў тэзісах т. т. Молатава і Куйбышава,—лічыць, што вялізарныя прыродныя багацьці краіны, бальшавіцкія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, узрасталочая актыўнасьць шырокіх мас рабочых і калгаснікаў і правільная лінія партыі—поўнасьцю забясьпечваюць такое разгорнутае пралетарскіх сіл сацыялістычнай гаспадаркі ў другім пяцігодзьдзі, на аснове якога будуць канчаткова ліквідаваны капіталістычныя элементы ў СССР. Канфэрэнцыя лічыць, што асноўнай палітычнай задачай другой пяцігодкі зьяўляецца канчаткова ліквідацыя капіталістычных элементаў і клясаў наогул, поўнае зьнішчэньне прычын, якія нараджаюць клясавую розьніцу і эксплёатацыю і перамога над перажыткамі ў эканоміцы і сьвядомасьці людзей, ператварэньне ўсяго працоўнага насельніцтва краіны ў сьвядомых і актыўных будаўнікоў бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва».

Далей, у тэзісах падкрэсьліваецца, што «разгорнутая ў першай пяцігодцы работа па ператварэньні СССР з краіны, якая ўвозіла машыны і абсталяваньне, у краіну, якая самастойна тварыце машыны і абсталяваньне, будзе заворшана і канчаткова забясьпечыць за СССР эканамічную самастойнасьць, што ахоўвае СССР ад ператварэньня яе ў прыдатак да капіталістычнай сусьветнай гаспадаркі» (XIV зьезд УсеКП(б). І далей у тэзісах гаворыцца, што «шпаркі рост сацыялістычнай гаспадаркі ў першыя дзьве другой пяцігодкі ў нацыянальных рэспубліках і абласьцях абумоўлівае ажыцьцяўленьне эканамічнай і культурнай адсталасьці нацыянальнасьцяй,—гэтай спадчыны ад царскага калёніяльна-капіталістычнага рэжыму».

У праекце пастаноў канфэрэнцыі мы маем наступнае ўказаньне: XVII канфэрэнцыя УсеКП(б) лічыць, што БССР зьяўляецца неадлучнай часткай усяго Савецкага Саюзу. На практычнай працы ў БССР мы можам найбольш выразна бачыць, як здзяйсняецца правільнасьць ленінскай нацыянальнай палітыкі і лініі на сацыялістычную індустрыялізацыю, якую праводзіць наша партыя. На прыкладах і фактах разьвіцьця нашай адсталай у мінулым краіны—Беларусі, мы можам пацьвердзіць ажыцьцяўленьне задач, ня раз запісаных у дакумантах нашай партыі, задач аб падцягненьні адсталых у мінулым краін у напрамку паскарэньня тэмпаў разьвіцьця прамысловасьці і індустрыялізацыі.

XIII зьезд КП(б)Б запісаў наступныя дырэктывы Цэнтральнаму Камітэту:

«Зьезд даручае Цэнтральнаму Камітэту ў далейшым працягнуць цьвёрды курс на індустрыялізацыю і на павялічэньне ўдзельнай вагі прамысловасьці, разьвіваючы ў першую чаргу тыя галіны прамысловасьці, якія працуюць на мясцовым сырцы: торф, лес, лён, буйнарогавая матар'ялы, перапрацоўка сельска-гаспадарчых прадуктаў і інш.».

На мінулых зьездах партыі ўжо досыць падкрэсьлівалася мінуулае Беларусі, становішча яе прамысловасьці і ўсёй гаспадаркі да таго часу, пакуль рабочая кляса і асноўная маса сялянства, пад кіраўніцтвам нашай партыі, узяла ўладу ў свае рукі. Я думаю, што няма патрэбы на гэтым зьезьдзе яшчэ раз падрабязна прыводзіць факты з мінулага.

Які малюнак мы маем цяпер у сэнсе разьвіцьця прамысловасьці і росту індустрыялізацыі нашай краіны?

Палітыка партыі забясьпечыла ўжо цяпер у БССР вядучую ролю прамысловасьці, такія тэмпы яе разьвіцьця, якія неабходны для сацыялістычнай рэканструкцыі ўсяе народнае гаспадаркі. Вось некалькі лічбаў, якія сьцісłяджаюць падцягваньне нашай прамысловасьці да ўзроўню перадавых пралетарскіх цэнтраў. Па тэмпах валавая прадукцыя БССР вырасла ў 1931 годзе на 79 проц., у той час, калі па ўсім СССР сярэдні рост за гэты-ж час раўняецца 21 проц. (у параўнаньні з 30 годам). Таксама, калі ўзяць тэмпы прыросту рабочых па БССР, то ў 1930 годзе мы маем ужо 140 проц. параўнальна з 1926-27 годам, у той час, калі па СССР прырост рабочых за гэты час складае 110,6 проц. Бы бачыце, што тэмпы агульнага разьвіцьця нашай прамысловасьці па выпуску валавой прадукцыі і рост рабочай клясы больш высокія, чым у СССР у цэлым.

На падставе гэтых інтэнсіўных тэмпаў разьвіцьця ўсяе народнае гаспадаркі, і ў першую чаргу прамысловасьці, адбыліся карэнныя зрухі ва ўсёй сацыяльна-эканамічнай структуры рэспублікі. БССР—у мінулым дробна-аграрная краіна—ужо на працягу першай пяцігодкі ператварэцца ў краіну індустрыяльна-аграрную. Удзельная вага прадукцыі прамысловасьці (прадукцыя асноўных галін народнай гаспадаркі) за ўвесь час нняўхільна павялічваецца. Калі ў 1928-29 годзе ўдзельная вага гэтай прадукцыі складала 23,6 проц., то ў 1930 годзе яна раўняецца 38,7 проц., а ў 1931 годзе—51,7 проц. На 1932 год мы будзем мець 55,3 проц. Удзельная вага пралетарыяту адносна да ўсяго насельніцтва ў 1928-29 годзе складала 1,47 проц., а ў 1931 годзе—2,92 проц. Таказь вялізарнага значэньня зрухі адбываюцца ў нашай прамысловасьці. Яны набываюць яшчэ большае значэньне на фоне таго, што мы перапраўляем намічэньні пяцігодкі ў выкананьні заданьняў нашай прамысловасьці. Напрыклад, калі паводле праектаваньняў пяцігодкі ўдзельная вага прамысловасьці павінна была складаць у 1932 годзе 38 пр., то, як я гаварыў, у сапраўднасьці ў 1932 годзе яна павінна будзе складаць 55,3 проц. Мы такім чынам павінны мець выкананьне пяцігодкі на 144,4 проц. па галавой прадукцыі прамысловасьці і 109 проц.—па колькасьці рабочых.

Мы маем значнае тэхніка-эканамічнае пераўзбраеньне нашай прамысловасьці. Аб'ём капітальных укладаньняў значна перавысіў тыя фонды, якія намічаліся пяцігодкай. Фонд асноўнай нашай прамысловасьці ў 1928-29 годзе ў сумарным азначэньні складаў 68.416 тыс. рублёў, а капітальныя ўкладаньні за 4 гады складаюць 275.390 т. На працягу гэтай пяцігодкі ўступіў у эксплёатацыю цэлы рад новых буйнейшых прадпрыемстваў ня толькі рэспубліканскага, але і саюзнага значэньня, як БелДРЭС імя Сталіна, Гомсельмаш, Бабруйскі дрэваапрацоўчы камбінат, аўтагавы завод і г. д. Рэканструюецца рад прадпрыемстваў, якія маюць вялізарнае значэньне, як, напрыклад, Добруская паперовая фабрыка, металапрацоўчы завод імя Варашылава, тарбарня «Бальшавік» і інш. Удзельная вага новых прадпрыемстваў у агульным выпуску прадукцыі прамысловасьці ВСНГ у 1931 годзе складае ўжо 46 проц. Вось малюнак таго, як выконваліся дырэктывы XIII зьезду КП(б)Б у сэнсе разьвіцьця нашай прамысловасьці.

Таварышы, адзначаючы ўсе тыя вялізарныя дасягненьні, якія мы маем па лініі разьвіцьця прамысловасьці, я павінен, аднак, з усёй сілай і выразнасьцю падкрэсьліць рад буйнейшых недахопаў і прарываў, што існуюць яшчэ ў рабоце прамысловасьці і тармозяць яшчэ больш пасьпяховае разьвіцьцё і ўмацаваньне вядучай ролі нашай прамысловасьці ва ўсёй народнай гаспадарцы і адносную агульную яе яшчэ слабасьць.

У першую чаргу—адвоона выкананьня прамфінпляну. Ня гледзячы на ўсю рэальнасьць і магчымасьць яго выкананьня, аб чым мы ня раз падкрэсьлівалі,—у 1931 годзе прамфінплян рэалізаваны толькі на 80,1 проц., у тым ліку па аб'ёме будаўніцтва—на 85,2 проц., па прамысловасьці ВСНГ—86,2 проц., па рэспубліканскай—74,4 проц., па прамысловасьці Наркамснабу па выпуску валавой прадукцыі—86,6 проц.

Найбольш буйныя прарывы ў выкананьні прамфінпляну ёсьць у такіх галінах прамысловасьці, як торфяная—50,6 проц., хэмічная—45,9 проц., керамічная—43,1 проц., металапрацоўчая—70,5 проц.

Асабліва слабым зьявіном зьяўляецца недавыкананьне якасных паказальнікаў, што з усёй сілай падкрэсьлівае выключна дрэнны ход мабілізацыі і скарыстаньня ўнутраных рэсурсаў.

Як ідзе зьніжэньне сабекошту? Па прамысловасьці ВСНГБ у 1928-29 годзе намечана было зьніжэньне на 6,4 проц., выкананна—на 4,9 проц. У 1929-30 годзе намечана было—11,5 проц., выкананна—7,8 проц. У 1931 годзе намечана — 7,8 проц., выканана ўсяго толькі 1,4 проц. Для таго, каб зразумець наколькі моцна невыкананьне гэтых паказальнікаў адбіваецца на мабілізацыі дадатковых сродкаў прамысловасьці, даволі паказаць, што толькі адзін процант зьніжэньня сабекошту дае для ўкладаньня ў нашу прамысловасьць дадатковых два мільёны рублёў.

Дрэннае выкананьне паказальнікаў мы маем і ў галіне падвышэньня прадукцыйнасьці працы. На 1931 год было намечана 33,5 проц., выкананна—16,8 проц. Па заработнай плаце было намечана 5,6 проц., выкананна—11,7 пр. Мае месца вялізарны разрыў паміж прадукцыйнасьцю і заработнай платай, прычым у такіх галінах прамысловасьці, як металапрацоўчая." Возьмем 1931 год. У першым квартале выкананьне пляну росту прадукцыйнасьці працы складае 65,8 проц., а па заработнай плаце—99,9 проц. Другі квартал: прадукцыйнасьць—64,4 проц., заработная плата—102,4 проц. Трэці квартал—прадукцыйнасьць—72 проц., заработная плата—113,3 проц. Як я ўжо падкрэсьліваў, мы маем няпоўнае выкананьне і па капітальным будаўніцтве прамысловасьці, адведзенага лічбы мной прыведзены. Асабліва адстаюць па капітальным будаўніцтве торфяная прамысловасьць, якая выканала 65 проц. сваёй праграмы, будаўнічая—62 проц., хэмічная—76 проц. і металапрацоўчая прамысловасьць—75 проц.

Гаворачы аб выкананьні якасных паказальнікаў нашай прамысловасьці, трэба асабліва падкрэсьліць дрэнную работу галін прамысловасьці за палепшэньне зьнутпчанай прадукцыі. Гэта трэба падкрэсьліць з усёй рашучасьцю, як гледзячы на рад посьпехаў у некаторых галінах нашай прамысловасьці, як швейная і абуткавая. Якасьць прадукцыі часта настолькі дрэнная, што далей пяцігодкі такое становішча мы ня можам.

Гаворачы аб выніках работы прамысловасьці, трэба падкрэсьліць, што па асобных галінах і прадпрыемствах тут ёсьць даволі спракаты малюнак. Побач з тымі перадавымі галінамі нашай прамысловасьці, якія ўжо выканалі пяцігодку за тры гады, побач з тымі прадпрыемствамі, якія ідуць упе радзе ў сэнсе выкананьня сваіх прамфінпляну, прыкладам чаго можа зьявіцца завод «Бальшавік»,—мы маем рад прадпрыемстваў, якія недапушчальна адстаюць. У дадатак да пералічаных мною галін прамысловасьці, я мог-бы прывесьці яшчэ цэлы рад, але я лічаю, што на зьезьдзе ў выступленьнях дэлегатаў з усёй шырынёю будуць аллюстраваны ўсе прычыны і недахопы, зьвязаныя, напрыклад, з работай БелДРЭС, якая забясьпечвае электраэнэргіяй такія буйнейшыя вузлы прамысловых цэнтраў, як Віцебск, Ворша Магілеў, шаўковая фабрыка і інш.

Мы лічым, што тыя буйныя прарывы, якія мелі месца і ёсьць яшчэ ў значнай меры на БелДРЭС і заводзе, зьяўляюцца проста ганебнай плямай на ўсёй нашай рабоце, плямай, якую трэба ва што б там ні стала зьмыць. Мы мелі рад буйнейшых прарываў у рабоце менскай электрастанцыі, што таксама выклікае перабой у рабоце нашай прамысловасьці і ў забясьпячэньні рабочага насельніцтва электраэнэргіяй. Бальшавікі Менску ўзялі рашучэ за выпраўленьне недахопаў у рабоце станцыі. І тут мы маем цяпер некаторы - арух. Я думаю, што менская партыйная арганізацыя даб'ецца таго, каб сталіца БССР—Менск не заставалася далей у такім становішчы, якое было раней. Мы маем ганебныя прарывы ў рабоце такіх буйнейшых прадпрыемстваў, як Добруская паперовая фабрыка, якая мае адказную ролю ва ўсёй нашай прамысловасьці, і мае вялізарнае значэньне для справы культурнай рэвалюцыі. Трэба, каб партарганізацыя і ў першую чаргу бальшавікі Гомельшчыны ва что-б там ні стала зьяўлячыці ў бліжэйшыя час усе тыя адмоўныя зьявішчы, якія ёсьць на Добрушы.

Дзе ляжаць карэньні недахопаў і прарываў у рабоце прамысловасьці? У першую чаргу ў тым, што мы яшчэ дрэнна ажыцьцяўляем 6 умоў тав. Сталіна ва ўсёй нашай рабоце. Там, дзе 6 умоў праводзяцца рашуча ў жыцьцё, там мы з посьпехам выконваем усе паказальнікі прамфінпляну, там, у тых галінах, аб якіх я ўжо раней гаварыў, там, дзе дрэнна выконваюцца ўмовы тав. Сталіна, ёсьць вялізарнейшыя прарывы і недахопы.

Буйным недахопам у рабоце нашай прамысловасьці зьяўляецца тое, што разам з дрэнным скарыстаньнем, слабым асваеньнем капіталаўкладаньняў,—у нас слаба механізаваны ўсе працэсы на самым прадпрыемстве. Такое становішча ў далейшым нецярпіма. Я павінен падкрэсьліць адно зьявішча, якое мы маем, і з якім трэба павесьці рашучую барацьбу—гэта недапушчальныя адносіны да машын. З боку гаспадарнікаў на радзе прадпрыемстваў бачуюць, прыкладна, такія разважаньні: «У нас машына старая і таму цяпер няма чаго асабліва клапаціцца ў сэнсе яе большага скарыстаньня і нагрузкі. Даваўце нам новыя машыны, узозьце гэтыя машыны з-за мяжы, купляйце іх». Я думаю, што з такімі настроямі мы павінны рашуча змагацца. Трэба са старога абсталяваньня выцісьнуць усё, што толькі можна, атрымаць ад машын максымальны эфэкт. Трэба змагацца са стаўкай на тое, каб выключна завозіць імпартныя машыны. Трэба паставіць задачу сапраўднага вырабу машын на нашых заводах. А мы можам гэта зрабіць. Некаторыя нашы прадпрыемствы паказваюць ужо добрыя прыклады аўладаньня новымі зьнутрачасьцямі вырабу найбольш складаных машын, як, напрыклад, завод імя Варашылава. Замест імпарту гэтых машын трэба выраблядь іх у нас, у Савецкім Саюзе.

Вялікім недахопам у нашай прамысловасьці, як і ва ўсёй народнай гаспадарцы, зьяўляецца адсталасьць электраўзброенасьці нашай прамысловасьці ад агульных тэмпаў разьвіцьця. Вось некаторыя падлікі электра-энэрга-ўзброенасьці параўнальна з СССР. У 1931 годзе на аднаго прамысловага рабочага электраўзброенасьць у кілёвагадзінах складала ў БССР 1595, а па СССР—2.000. Такім чынам, мы бачым, што ў БССР у гэтай галіне ёсьць адстаўаньне ў адносінах агульнасаюзнага ўзроўню, прычым гэта адставаньне асабліва рэзка выявілася ў гэтым годзе.

У чым нашы далейшыя задачы ў галіне прамысловасьці? Яны заключаюцца ў мабілізацыі ўвагі на тых вузлавых момантах, аб якіх я гаварыў. Асабліва ўпор трэба арабіць на выкананьні якасных паказьнікаў у 1932 годзе.

Таварышы, на 1932 год пазоле прамфінпляну мы вызначылі наступныя заданьні: выпуск валавой прадукцыі рэспубліканскай прамысловасьці зацьвярджан у суме 492.422 т. руб., зьніжэньне сабекошту—на 5,6 проц., павышэньне прадукцыйнасьці працы—на 15,8 проц., рост зарплаты—на 7 проц. Капіталаўкладаньні выначаюцца ў суме каля 36 мільёнаў руб. На выкананьне прамфінпляну 4-га, заключнага году пяцігодкі мы павінны мабілізаваць усю КП(б)Б, усю рабочую клясу, усканцэнтраваўшы цэнтр сваёй увагі на барацьбу за якасныя паказальнікі. 1932 год павінен быць годам рэзкага палепшэньня якасьці работы, разьвіцьця яшчэ больш высокіх тэмпаў, падрыхтоўкі неабходных умоў для выкананьня другой пяцігодкі. Мы павінны ўжо з пачатку году ўзяць належныя тэмпы, ужыць неабходныя мерапрыемствы, якія-б цалкам забясьпечылі выкананьне адказных задач, што стаяць перад намі.

Які напрамак далейшага разьвіцьця нашай прамысловасьці павінен быць намі ўзяты? Зусім зразумела, што мы павінны выходзіць з установкі далейшага разгортваньня індустрыялізацыі краіны, далейшага ўмацаваньня вядучай ролі прамысловасьці ў сацыялістычнай рэканструкцыі ўсяе народнае гаспадаркі. Асновай нашага прамысловага разьвіцьця павінна быць мабілізацыя ўсіх унутраных рэсурсаў, максымальнае скарыстаньне сыравой базы, якая ёсьць у БССР.

Трэба больш рашуча пайсьці на ўзьняцьце найбольш адсталых раёнаў. У гэтым напрамку мы ўжо зрабілі некаторыя крокі. Так, шпарка разгортваецца прамысловае будаўніцтва ў Магілеве, Крычаве. Мы павінны пайсьці далей па шляху ўзьняцьця прадукцыйных сіл гэтых новых раёнаў, зараз яшчэ адсталых параўнальна з асноўнымі буйнымі раёнамі, дзе ўжо шырока разгарнулася прамысловае будаўніцтва.

Вядучай галінай, на якой мы павінны канцэнтраваць увагу, зьяўляецца электрыфікацыя БССР, тэхнічнае пераўзбраеньне народнай гаспадаркі. У гэтым напрамку вялікае значэньне набывае пачатак пабудовы ў бягучым годзе Менскай электрастанцыі, далейшае разгортваньне будаўніцтва другой чаргі БелДРЭС імя Сталіна, пабудова Гомельскай раённай электрастанцыі.

Другая важнейшая галіна, вакол якой павінна быць згрупавана ўвага партыі — гэта торф, як энэргетычная і сырцовая база прамысловасьці ўсяе народнае гаспадаркі. Мы маем 2.600 тыс. га забалочаных зямель—тарфяных балот. Сярод важнейшых пытаньняў нашага эканамічнага разьвіцьця трэба адзначыць хэмічную прамысловасьць сапрапэліты, фасфарыт, лесахэмію, ацэтон і інш. Праведзеныя досьледы паказваюць, што ўсе гэтыя аб'екты павінны адыгрываць важную ролю, як сырэц, на якім можа разгортвацца прамысловае будаўніцтва.

II. Вынікі перспэктывы прамысловага разьвіцьця

Важнае значэньне набывае перакід на пагыбленую мэханічную і хэмічную апрацоўку драўніны, скарыстаньне яе для прамысловых мэт, разгортваньне вырабу будаўнічых матар'ялаў. Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на новыя віды будматар'ялаў, у прыватнасьці, шкло. У сувязі з шырокім разьмерамі спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі ў матрамку тэхкультур, задачую ролю набывае тэкстыльная прамысловасьць. Мы па-бальшавіцку павінны ўзяцца за разгортваньне харчовай прамысловасьці на базе бэкоўнай сыравагадоўлі, маточных прадуктаў, бульбы, садавіны, гародніны, скарыстаньня дзікай гародніны і фруктаў.

Вось, таварышы, асноўныя галіны і віды прамысловасьці, на якіх мы павінны ў далейшым сканцэнтраваць увагу, з якімі зьвязана дытаньне найлепшага выкарыстаньня багатых мясцовых рэсурсаў БССР.

З галін прамысловасьці, якія працуюць на прывозным сырцу, першае месца павінна быць адведзена металяпрамысловасьці. Поўнае скарыстаньне ўсяго асартыменту машын мэтадапрамысловасьці дае магчымасьць абслужыць ня толькі асноўныя галіны прамысловасьці БССР—торф, будаўніцтва, хэмію, мэталь—але можа даць высокякасныя машыны і для іншых раёнаў Савецкага Саюзу. Магчымасьць злучэньня беларускага торфу і прыўлянага коксу з украінскай рудой, плюс скарыстаньне жалезных руд, якія ёсьць у нас, падводзіць магутную базу пад мэталюргічную прамысловасьць БССР. Адначасова мы павінны не зьмяншаць нашай увагі на далейшае разьвіцьцё такіх галін прамысловасьці, як скураная, швейная, папяровая.

У эканоміцы нашай краіны зялёнае значэньне мае прамысловая кааперацыя. У мэтах найбольшага скарыстаньня мясцовых рэсурсаў мы павінны шырэй разгортваць каапераваньне працоўнага насельніцтва, узмацніць яшчэ больш ролю прамысловай кааперацыі.

Канчаючы свае заўвагі аб рабоце прамысловасьці, я яшчэ раз хачу падкрэсьліць, што асноўнай і рашаючай прадпасылкай часьпяховага выкананьня задач, якія стаяць перад намі ў чацьвертым, заключным годзе пяцігодкі, зьяўляецца поўнае прадпрыемство ў жыцьцё 6 умоў тав. Сталіна, рашучая барацьба з дэкларацыйнасьцю, з падменай бавой практычнай работы ў гэтых адносінах разважаньнямі і тутаркамі.

III. За далейшую рэканструкцыю транспарту

У адпаведнасьці з агульнымі задачамі, якія стаяць перад партыяй

XIV ЗЬЕЗД КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (БАЛЬШАВІКОЎ) БЕЛАРУСІ

Справаздача Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б

Працяг дакладу тав. ШАРАНГОВІЧА

конваюцца на транспарце 6 умоў тав. Сталіна, асабліва ў сэнсе перабудовы работы кіруючага гаспадарчага апарату, у сэнсе рашучага выкараненьня бюракратычных адносін да тэтай перабудовы. Яшчэ мае месца расхлябанасьць, недысцыплінаванасьць, разгільдзяйства.

Трэба адзначыць, што, калі 6 умоў тав. Сталіна выконваюцца транспартам наогул неспустарчальнымі тэмпамі, то асабліва дрэнна стаіць справа з укараненьнем на транспарце гаспадарчага разрахунку. У прыватнасьці, я павінен сказаць, што пайдзе мы ня сустрэлися з такім упартым апартуністычным супраціўленьнем пераходу на гаспадарчы разрахунак, як на транспарце. Вось вам асабліва наглядны прыклад. Начальнік Віцебскага раёну адкрыта выступаў супроць увядзеньня гаспадарчага разрахунку на чыгунцы, асабліва на паравозе, заяўляючы, што ён нават ня верыць у гэта мерапрыемства. Зразумела, зусім правільна было пастаўлена пытаньне аб зьняцьці гэта з апартуніста.

Пленум ЦК УсеКП(б), а таксама пленум ЦК КП(б)Б вызначыў рад задач у галіне далейшай работы чыгуначнага транспарту, даў канкрэтныя ўказаньні, вызначыў напрамак найбольш поўнага скарыстаньня тых рэсурсаў, якія сёньня мае транспарт. Паводле дырэктыў ЦК УсеКП(б), мы абралі спэцыяльнага сакратара Цэнтральнага Камітэту па транспарце, в тым, каб забясьпечыць яшчэ больш канкрэтнае кіраўніцтва ня толькі дырэкцыяй чыгункі, але і нізавымі зьвеньнямі транспарту—раёнам, дэпо і т. д. Мы падыйшлі даволі ўважліва да гэтых зьвеньняў, нават заслухалі на адным з пасяджэньняў сакратарыяту ЦК даклад паравознай брыгады. Трэба, каб усе нашы вышэйшыя арганізацыі таксама канкрэтна падыходзілі да справы кіраўніцтва, асабліва нізавымі зьвеньнямі, ставячы практычнай задачай ліквідацыю абязьлічкі, ураўнілаўкі, укараненьне гаспадарчага разрахунку, паляпшэньне працы служэбы цягі, эксплёатацыі, павялічэньне даходу транспарту, яго тэхнічнае перааўзбраеньне.

У нашай рабоце асабліва за апошні адрэзак часу вялікае месца займалі пытаньні дарожна-шасэйнага будаўніцтва, якое ў эканоміцы БССР адыгрывае зьлікае гаспадарча-палітычнае значэньне. Досыць прывесьці такую даведку Галоўдартрансу, што страты ад бездарожжа рабіліся ў 1928 годзе 10 млн. руб., у 1929 годзе—14 млн. р., у 1930 г.—24 млн. руб. і ў 1931 г.—49 млн. рублёў. Гэта значыць, што з ростам грузазвароту, растуць і нашы страты, зьвязаныя з бездарожжам.

Я павінен хаця-б коратка спыніцца на водным транспарце, які ва ўсёй нашай эканоміцы таксама займае значнае месца. Мы маем некаторыя зрухі ў галіне разгортваньня воднага транспарту, аднак, тут ёсьць яшчэ вялікія прарывы. Водному транспарту да гэта та часу не надавалася яшчэ належнай увагі, гэта справа ня ўзьнята яшчэ на неабходную палітычную вышыню. Задача заключаецца ў тым, каб у сувязі з задачай перабудовы чыгуначнага транспарту, прыняць больш рашучыя крокі для ўзьняцьця на вышэйшую ступень і нашага воднага транспарту.

IV. Сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі

На падставе ажыцьцяўленьня ленінскай палітыкі, умацаваньня пралетарскага кіраўніцтва працэсамі рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, уся КП(б)Б і яе Цэнтральны Камітэт актыўна займаліся пытаньнямі сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

У трэцім рашаючым годзе пяцігодкі мы дабіліся вялізарных сацыяльна-эканамічных зрухаў, з якімі КП(б)Б прыйшла да свайго XIV зьезду. Гэтыя зрухі ў першую чаргу выяўляюцца ў магутным росьце калектывізацыі, у рашучым павароце бядняцка-серадняцкіх мас на шлях сацыялізму.

Калі на 1 лістапада 1928 г. было толькі 0,7 проц. калектывізацыі, на 1 чэрвеня 1930 году—11,1 проц., на 1 студзеня 1931 г.—15 проц., то на 1 ліпеня 1931 г. мы мелі ўжо 40 проц. і на 20 сьнежня—50,3 проц. Рад раёнаў, як Лепельскі, Койданаўскі, Талачынскі, Чэрвеньскі, Сенеінскі, Бягомльскі, Касьцюковіцкі, Чэрыкаўскі і інш., у асноўным завяршылі суцэльную калектывізацыю.

Паводле даных Калгасцэнтру сацыяльны склад членаў калгасаў наступны (гэтыя даныя адносяцца да вясны 1931 г.): беднякоў—32,8 проц., сераднякоў—55 проц. і іншых—12,2 проц. У групу «іншых» уваходзяць служачыя: настаўнікі, аграномы, работнікі МТС, сельсаветаў і г. д. Аднак, трэба адзначыць, што ў некаторых калгасах ёсьць засьмечанасьць кулацка-заможным элемэнтам. Трэба ў штодзённай рабоце ачышчаць калгасы ад пралезных туды кулакоў, якія з сярэдзіны імкнуцца разбурыць калгасную вытворчасьць.

Посьпехаў у калектывізацыі мы дабіліся ў рашучай барацьбе з правым апартунізмам, з самацёчнымі настроямі ў калгасным будаўніцтве, з «левымі» загібамі, якія былі даволі пашыраны ў некаторых раёнах. Гэтых посьпехаў мы дабіліся з улікам усіх абставін і ўмоў нашай работы ў нацыянальнай рэспубліцы—Беларусі.

За час з XIII зьезду мы маем значнае павышэньне росту і ролі саўгасаў у сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Калі пасеўная плошча саўгасаў у 1928 годзе складала 41.600 га, то ў 1931 г. было 115.000, а ў 1932 г. намечана 250.000 га. Плошча пад саўгасамі амаль пачынаючы з 1928 г. патроілася.

Капітальныя ўкладаньні ў сельскую гаспадарку расьлі наступным чынам: у 1930 г.—42.123 тыс. руб., у 1931 г.—77.844 тыс., на 1932 г. намечана 165 мільёнаў руб. Асабліва вялікае месца ў капіталаўкладаньнях вызначаецца росту машынізацыі сельскай гаспадаркі. Калі ў 1929 г. на гэту мэту скарыстана 5.400 тыс. руб., то ў 1930 г.—7.726 тыс. руб., у 1931 г.—17,072 тыс. руб. і на 1932 год намечана 27.500 тыс. руб. Калі да XIII зьезду была адна машына-трактарная станцыя, то зараз налічваецца 1900 трактараў. На 1932 г. намечаны ахоп усіх раёнаў машына-трактарнымі станцыямі.

Ахоп калгасамі 50 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, разьвіцьцё саўгасаў, рост капіталаўкладаньняў, мэханізацыя сельскай гаспадаркі—сьведчаць аб вялізарных дасягненьнях КП(б)Б у справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

За гэты час зроблен значны крок наперад у сэнсе спэцыялізацыі, узьняцьця таварнасьці саўгасаў і калгасаў, разьвіцьця малочнай жывёлагадоўлі, сьвінагадоўлі, тэхнічных культур—ільну і канапель.

Роля сацыялістычнага сэктару ў нашай сельскай гаспадарцы ўвесь час павялічваецца. У 1931 г. калгасы засялі 47,3 проц. яравога кліну, з якога па ільне—51,3 проц., гародніне—64,1 проц., коранаплодах—66 проц., шматгадовых травах—58,2 проц. і аднагадовых травах —62 проц.

Калгасы, пры дапамове пралетарскай дзяржаве, ужо ў мінулым годзе паказалі прыклады пасьпяховай барацьбы за выкананьне чарговых гаспадарча-палітычных задач, паказалі вялізарную перавагу перад аднаасобным сэктарам. Калгасы значна лепш скарыстоўвалі як людзкую, так і цягавую сілу. На калгасьніка, а таксама на калгаснага каня і машыну прыпадала значна большая доля апрацоўкі глебы, засеву, узьняцьця зяблі і г. д.

Пры яшчэ зусім нізкай прадукцыйнасьці нашага стада, у сацыялістычным сэктары ўсё-ж такі маем больш высокі процант удою. Па саўгасах удой малака ў год (у сярэднім на адну карову) складае 1.400 кілёграм, у калгасах—1.100, у індывідуальным сэктары—920 кілёграм, а ў сярэднім па БССР 1000 кгр.

На падставе тых мерапрыемстваў, якія праводзіла партыя ў галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, удзельная вага БССР у агульнай пасеўнай плошчы СССР увесь час узрастае. Асабліва яркае адлюстраваньне мае павышэньне ўдзельнай вагі пасеўнай плошчы ільну, якая складала ў 1931 г.—10,2 проц., на 1932 г.—12,5 проц. Бульба—8,9 проц., у 1932 г.—10 проц. У валавым зборы па ільнавалакне ўдзельная вага ў 1930 г. складала 6,6 проц., на 1932 год—12,6 проц. Па бульбе—10 проц., намячаецца— 12,5 проц.

Такім чынам, і ў галіне сельскай гаспадаркі ёсьць значныя посьпехі значнае павялічэньне пасеўнай плошчы, асабліва на тэхкультурах. Наогул удзельная вага БССР ва ўсёй агульнай пасеўнай плошчы Саюзу ССР увесь час узрастае.

Гаворачы аб вялізарных посьпехах у галіне рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, трэба, аднак, з усёй сілай падкрэсьліць тыя новыя задачы, вялізарныя і трудныя задачы, якія перад намі стаяць на гэтым вучастку сацыялістычнага будаўніцтва

Асноўнае, што павінна быць падкрэслена на зьезьдзе і аб чым зьезд павінен даць дырэктывы для далейшай работы ўсёй партыйнай арганізацыі і Цэнтральнаму Камітэту—гэта **барацьба за якасьць работы ў сельскай гаспадарцы,** за павышэньне таварнасьці саўгасаў і калгасаў.

Пасьпяховае вырашэньне праблемы якасьці азначае далейшую перамогу ў рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, азначае сабой далейшы рост саўгаснага і калгаснага будаўніцтва.

Адсюль задача—саўгасы і МТС павінны яшчэ больш адыграць сапраўды вядучую ролю ва ўсёй рабоце па сац. рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, змагацца за ажыцьцяўленьне цэнтральнай задачы—арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Для таго, каб пасьпяхова справіцца з гэтым трэба поўнасьцю ажыцьцявіць **шэсьць умоў тав. Сталіна** у рабоце МТС, саўгасаў і калгасаў.

Таварышы! Каб найбольш ярка паказаць, што мы маем у сэнсе дрэннай якасьці нашай работы ў галіне сельскай гаспадаркі, каб найбольш ярка паказаць тыя вялізарныя страты, якія атрымаліся ў сувязі з дрэннай работай, я прыпяструю некаторыя даныя.

Плян зяблі выканан у 1931 г. толькі на 60 проц. Недавыкананьне плыну на 40 проц. зьнижае ўраджайнасьць па ільне, бульбе, гародніне, авсе і ячмені. Па падліках НКЗБ гэта зьнижэньне ўраджайнасьці дае страты для пралетарскай дзяржавы на суму ў 20 мільёнаў руб. Гэта толькі з прычыны недавыкананьня плыну ўзьняцьця зяблі.

Такія прасьцейшыя мерапрыемствы, як ачыстка насеньня, радковы пасеў, барацьба са шкодзікамі, вапнаваньне, увядзеньне севазвароту і інш. даюць павышэньне ўраджайнасьці (выходзячы з плыну 1932 г.) на збожжавых культурах на 36,5 проц., або дадатковa 8.081 тыс. цэнтнэраў да намечанай пасеўнай плошчы. Па бульбе—34 проц., або 26.180 тыс., па ільнавалакне—31 проц., або 111 тыс. цэнтнэраў, па гародніне—34 проц., або 2.380 тыс. цэнтнэраў дадатковых рэсурсаў.

Калі параўнаць нашу ўраджайнасьць і прадукцыйнасьць жывёлы з заходня-эўрапэйскімі краінамі, то мы ўбачым наступную розьніцу. Ураджайнасьць па ільна-валакне з аднаго гэктара ў **Бэльгіі—11 цэнтн., Францыі—7,5, Вэнгрыі—7,6, Галяндыі 5,8, а па БССР—2,2 цэнт.** Удойнасьць (ад аднэй каровы ў кілёграмах): у **Галяндыі—3.000, у Нямеччыне—2.200, Даніі—2.600, БССР 1.000.** Карова ў Нямеччыне трохгадовага ўзросту мае вагу 4,5 цэнтн., тады калі ў нас сярэдняя вага каровы—2,5 цэнтнэра. Ялавасьць па каровах у нас даходзіць да 15 проц., што складае недаатрыманьне дзяржавай 160.000 цялят. Ялавасьць сярод сьвіней даходзіць да 25-30 проц., што складае недаатрыманьне дзяржавай 1,5 мільёнаў парасят у год.

Па Сьвінаводу ў гэтым годзе процант адыходу маладняка пасьля апаросу складаў 38 проц. і г. д.

Усе паданыя факты высоўваюць перад намі, як асноўную задачу, іменна павышэньне якасьці работы ў сельскай гаспадарцы, укараненьне сапраўды сацыялістычных форм і мэтадаў працы, правільны догляд сьвіней і кароў, прыстасаваньне агра і зоатэхнікі ў саўгасах і калгасах.

Адзначаючы дасягненьні ў калгасным будаўніцтве, якія КП(б)Б мае за час з XIII да XIV зьезду адначасова трэба спыніцца на тых **памылках** ЦК КП(б)Б, якія былі дапушчаны ў пытаньнях калгаснага будаўніцтва, спыніцца на фактах «лявацкіх» загібаў, якія мелі і нават маюць месца ў некаторых раёнах.

Таварышы! На ліпеньскім пленуме ЦК КП(б)Б была прынята ўстаноўка адносна тэмпаў калектывізацыі, якая арыентавала КП(б)Б, каб калектывізацыю ў асноўным скончыць да канца 1932 г., каб калектывізаваць да вясны 32 г. 75 пр. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Пасьля пленуму была апублікавана пастанова ЦК УсеКП(б) ад 2 жніўня, якая вызначыла тэмпы і далейшыя задачы ў калгасным будаўніцтве. Пастанова ліпеньскага пленуму ЦК КП(б)Б разыходзілася з пастановай ЦК УсеКП(б) у сэнсе тэмпаў калектывізацыі у сэнсе канцэнтрацыі ўвагі на асноўнай цэнтральнай задачы—арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

Пасьля пастановы ЦК УсеКП(б), бюро ЦК у рашэньні ад 13 верасьня не зьмяніла фармулёўкі ліпеньскага пленуму ЦК, зацьвердзіла ранейшыя тэрміны аб скончэньні калектывізацыі ў асноўным да канца 1932 году., не падкрэсьліўшы задачу арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, як цэнтральную для ўсіх раёнаў. Гэтым рашэньнем мы яшчэ больш паглыбілі тую памылку, якую дапусьцілі ў рэзалюцыі ліпеньскага пленуму ЦК КП(б)Б.

У адным з нумароў **«Правды»**, у артыкуле «Не отставать и не забегать» нашы пастановы зусім **правільна** былі раскрытыкаваны, ім была дана правільная палітычная кваліфікацыя. Лістападаўскі абʼяднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б адмяніў ранейшыя ўстаноўкі, выправіў памылкі, цалкам кіруючыся пастановаю ЦК УсеКП(б) ад 2 жніўня аб скончэньні ў асноўным калектывізацыі БССР у 1932-33 г. Пленум асобна паставіў пытаньне аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, зрабіў гэта пытаньне цэнтральным для ўсёй КП(б)Б у справе далейшага калгаснага будаўніцтва.

З часу выпрацаваньня памылак, ЦК КП(б)Б канцэнтруе ўсю ўвагу на арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, ЦК правёў вялікую работу па выкрыцьці фактаў «лявацкай» недаацэнкі арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў у радзе раёнаў. Выкрылі факты, зьвязаныя з перагібамі, з адміністраваньнем у адносінах бядняцка-серадняцкіх мас, калгасаў і калгасьнікаў, якія (перагібы) перапляталіся з правым апартунізмам, ударылі па перагібах, зрабілі адпаведныя арганізацыйныя вывады, да раённага партыйнага кіраўніцтва ў некаторых раёнах.

Мы выкрылі такія факты ў **Койданаўскім, Капыльскім, Асіпавіцкім,** раёнах і інш., з чым зьвязана іменна і зьняцьце парткіраўніцтва гэтых раёнаў.

У Койданаўскім раёне выкрыты простыя факты «галавакружэньня ад посьпехаў». Пасьля пасьпяховага сканчэньня веснавой сяўбы, завяршэньня ў асноўным суцэльнай калектывізацыі, у раённых работнікаў ад посьпехаў закружылася галава, яны ігнаравалі цэнтральную задачу—арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. У Койданаўшчыне фактычна паўтарылася тое, што было ў некаторых раёнах у 1930 г. Койданаўскае парткіраўніцтва асьмелілася зьверху дэкрэтаваць антымальны і мінімальны разьмер калгасаў ад 500 да 3.000 га. Дырэктар МСТ Макарэвіч «на сакрэту» даваў дырэктыву аб стварэньні «гігантаў» у 6.000 га. Узбуяненьне, праведзенае ў адміністрацыйным парадку, без актыўнага ўдзелу калгасных мас, ня спрычыніла арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаваньню калгасаў, тармазіла пасьпяховае правядзеньне ўборачнай кампаніі.

ЦК выкрыла за гэты час агідныя зьявішчы ў адносінах да бядняцка-серадняцкіх мас ў пытаньні падатковай палітыкі, правядзеньня загатовак у такім раёне, як Лельчыцкі. Там былі самыя абуральныя факты з боку самога парткіраўніцтва, якія выявіліся ў антысерадняцкіх перагібах, у парушэньні ленінскага прынцыпу адносін да серадняка.

Таварышы! Мы можам зараз канстатаваць, што **партарганізацыя ў асноўным павярнулася тварам да арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.** Наша задача заключаецца ў тым, каб і надалей рашуча выкрываючы і выпраўляючы скажэньні лініі партыі ў калгасным будаўніцтве, якія мелі і яшчэ маюць месца ў некаторых раёнах, больш рашуча ўзяцца за распрацоўку ў правядзеньне ў жыцьцё раду практычных мерапрыемстваў, зьвязаных з арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньнем калгасаў. **Менш дэкларацыйнасьці—больш канкрэтнай работы.** Калі мы будзем толькі дэкляраваць, а не працаваць, то гэта зьявіцца для нас найбольш небясьпечным, найбольш недапушчальным у правядзеньні ўсіх мерапрыемстваў па арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

Што зьяўляецца рашаючым у калгасным будаўніцтве на даным этапе? Асноўнае, як гаварыў і як учыў нас Ленін, гэта **павышэньне прадукцыйнасьці працы,** «гэта ў канчатковым выніку са мае галоўнае для перамогі новага грамадзкага ладу». Нам трэба лепш арганізаваць людзкія і іншыя сілы ў калгасах, каб выканаць задачы, зьвязаныя з павышэньнем прадукцыйнасьці працы ў сельскай гаспадарцы.

Узьняць прадукцыйнасьць працы можна толькі на аснове правільнай арганізацыі працы, укараненьня зьдзельшчыны, ліквідацыі абязьлічкі і ўраўнілаўкі. Паводле афіцыяльных вестак, на 20 сьнежня праведзена на зьдзельшчыну 86,8 проц. калгасаў, забясьпечана працоўнымі кніжкамі—86,7 проц., вядуць рэгулярны запіс працадзён—73,9 проц. калгасаў. Аднак, я павінен з усёй рашучасьцю сказаць, што ў значнай ступені ўсё гэта толькі фармальныя весткі, што на справе мы ня ва ўсіх калгасах маем сапраўдную зьдзельшчыну.

Для прыкладу я прывяду некаторыя даныя па 40 калгасах, сабраныя пры абсьледаваньні іх ў часе веснавой пасеўкампаніі. Працоўная сіла скарыстана ўсяго толькі на 57 проц., на адыходніцтве працавала—8 проц., засталося не скарыстана 35 проц. рабочай сілы.

Нормы Калгасцэнтру ня выконваліся. Па ворыве адналямешным плугам 30 проц. калгасаў зьнізілі ўстаноўленую Калгасцэнтрам норму на 25 проц., па ворыве двухлямешным плугам 54,5 проц. калгасаў зьнізілі норму на 30-50 проц. Гэта ў той час, калі нормы Калгасцэнтру зьяўляюцца зьменшанымі, аб чым сьведчыць той факт, што 33 проц. усіх калгасьнікаў перавыканалі нормы Калгасцэнтру ад 20 да 40 проц..

З гэтага-ж абследваньня відаць, што 34,1 проц. ўсіх калгасьнікаў запісваюцца працадні раз ў месяц і нават радзей.

Паданыя факты сьведчаць аб тым, што ў нас яшчэ зусім дрэнна са справай арганізацыі працы, з увядзеньнем зьдзельшчыны, са скарыстаньнем рабочай сілы ў калгасах

Перад намі з усёй вострасьцю стаіць пытаньне, каб распрацаваць рад мерапрыемстваў у галіне павышэньня і ўвядзеньня зьдзельшчыны, выпрацоўкі норм, раўняючыся па перадавых калгасьніках, стымуляваць аплату калгасьнікаў у большым напружаньні пэрыяды працы. Распрацаваць рад мерапрыемстваў, зьвязаных з ліквідацыяй ураўнілаўкі і абязьлічкі. Арганізаваць брыгады ў часе веснавой сяўбы на вытворчай, а не тэрытарыяльнай адзнацы, прымацаваць да брыгад адпаведныя палявыя вучасткі, замацаваць за брыгадамі і кожным калгасьнікам сродкі вытворчасьці, якія-б яны поўнасьцю выкарысталі, за якія-б яны цалкам адказвалі. Больш рашуча пераносіць формы і мэтады працы, выпрабаваныя ў нашай прамысловасьці, разгортваючы сацспаборніцтва і ўдарніцтва, буксір і г. д.

Задача па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў зьяўляецца адначасова задачай **перавыхаваньня калгасьнікаў**—учарашніх бедняко ў і серадняко ў аднаасобнікаў, якія прынесьлі ў калгасы індывідуалістычную псыхалёгію, дробнаўласьніцкія настроі.

Тав. Сталін у сваёй прамове на канфэрэнцыі аграрнікаў-марксістаў гаварыў наступнае:

«Ці ёсьць элемэнты клясавага змаганьня ў калгасах? Так, ёсьць. Ня можа ня быць элемэнтаў клясавага змаганьня ў калгасах, калі там захоўваюцца яшчэ перажыткі індывідуалістычнай альбо нават кулацкай псыхалёгіі, калі там ёсьць яшчэ некаторая няроўнасьць. Ці можна сказаць, што клясавае змаганьне ў калгасах роўназначна клясаваму змаганьню па-за калгасамі? Не, нельга. У гэтым і заключаецца памылка нашых «левых» фразёраў, што яны ня бачаць гэтай розьніцы. Што значыць клясавае змаганьне па-за калгасамі да стварэньня калгасаў? Гэта значыць змаганьне з кулаком, які ўладае прыладамі і сродкамі вытворчасьці і закабаляе сабе беднату пры дапамозе гэтых прылад і сродкаў вытворчасьці. Гэта змаганьне прадстаўляе змаганьне не на жыцьцё, а на сьмерць. А што значыць клясавае змаганьне на базе калгасаў? Гэта значыць рассеяць за ўсё, што кулак разьбіт і пазбаўлен прылад і сродкаў вытворчасьці. Гэта значыць, на-першае, што беднякі і сераднякі абʼяднаны ў калгасы на базе абагуленьня асноўных прылад і сродкаў вытворчасьці. Гэта значыць, нарэшце, што справа ідзе аб змаганьні паміж членамі калгасаў, з якіх адны яшчэ ня вызваліліся ад індывідуалістычных і кулацкіх перажыткаў і спрабуюць выкарыстаць некаторую няроўнасьць у калгасах на сваю карысьць, а другія хочуць выгнаць з калгасаў гэтыя перажыткі і гэтую няроўнасьць. Ці ня ясна, што толькі сьляпыя ня могуць бачыць розьніцы паміж клясавым змаганьнем на базе калгасаў і паміж клясавым змаганьнем па-за калгасамі».

Вось чаму вучыць тав. Сталін, калі мы падыходзім да пытаньня, зьвязанага з перавыхаваньнем калгасьнікаў, з арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньнем калгасаў.

У нас ёсьць рад такіх фактаў, якія гаворыць аб неразуменьні таго, што толькі з разгортваньнем **новай сацыялістычнай працы, толькі пры ўпартай штодзённай напружанай рабоце, пры ўздыме гэтай работы на больш высокую ступень, пры разгортваньні палітычна-выхаваўчай масавай работы сярод калгасьнікаў**—мы зможам паступова, не за адзін месяц і не за адзін год, неравыхаваць нашага калгасьніка, узьняць яго палітычны ўзровень на вышэйшую ступень, да разуменьня агульна-пралетарскіх задач.

Выкарчоўваючы дробнаўласьніцкую псыхалёгію трэба больш рашуча змагацца з кулацкімі рвацкімі тэндэнцыямі ў паасобных калгасах. Умацоўваць і паляпшаць мэханізацыю сельска-гаспадарчых работ, асабліва па працаёмкіх культурах: лён, каноплі, бульба. Мэханізаваць усе працэсы, зьвязаныя з разьвіцьцём жывёлагадоўлі.

За большую эфэктыўнасьць работы трактара, кожнай сельска-гаспадарчай машыны. Ужываньне сельска-гаспадарчых машын аблягчае працу калгасьніка, дае магчымасьць вызваліць значную колькасьць рабочай сілы для сацыялістычнай прамысловасьці. Там, дзе існуюць добрыя гаспадары, дзе правільна выкарыстоўваецца трактар, бульбакапалка, жняярка і іншыя машыны, там адрымліваецца большая эфэктыўнасьць у працы і наадварот, там, дзе пануе абязьлічка, дзе ёсьць барбарскія адносіны да машыны, там эфэктыўнасьць працы нізкая, сабекошт с.-г. прадукцыі больш высокі.

Ня гледзячы на значную мэханізацыю, у нас яшчэ **рашаючай сілай у сельскай гаспадарцы застаецца конская цягавая сіла.** Павесьці рашучую барацьбу з разбазарваньнем, забоем коняй, прыцягваць да адказнасьці тых, хто пад уплывам кулацкай агітацыі імкнецца здаць коня ў архіў.

Савецкая Беларусь зьяўляецца краінай жывёлагадоўлі і тэхнічных культур. Адозва ЦК УсеКП(б) і СНК СССР ад 30 чэрвеня дае адпаведную ўстаноўку ў вырашэньні жывёлагадоўчай праблемы. Выконваючы дырэктывы XIII зьезду КП(б)Б, мы шмат увагі аддавалі разьвіцьцю жывёлагадоўлі. Удзельная вага БССР, як жывёлагадоўчага раёну, у далейшым усё больш і больш будзе павышацца. Мы цяпер ужо па сьвінагадоўлі маем 12 проц. усяго сьвінога пагалоўя ў Саюзе.

Асноўную ўвагу ў пытаньнях далейшага разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі павінны займаць саўгасы і калгасы—наш сацыялістычны сэктар.

Ужо зараз ён займае галоўнае месца. Возьмем саўгасы. Калі ўдзельная вага буйнай рагатай жывёлы ў 1930 годзе складала 2,2 проц., дык у 1932 годзе—5,9 проц. У калгасах адпаведна — 9,3 проц., будзе складаць—61,2 проц. Сьвіньні па саўгасах складалі 1 проц. у 1930 годзе, 7,4 проц.—у 1931 годзе і 11,9 проц.—у 1932 годзе.

Па калгасным сыстэме — 4 проц. у 1930 годзе, 49,6 проц.—у 1931 годзе і 61,7 проц. — у 1932 годзе.

Аднак, ня гледзячы на тое, што сацыялістычны сэктар ужо займае і будзе займаць вядучае месца ў разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі, мы маем вялікія прарывы ў выкананьні пляну па ўкамплектаваньні стада, як па трэсьце, так і па калгасных таварных фэрмах. Напрыклад, зацьверджаны плян для Белканторы трэсту «Сьвінавод» вызначае па агульным пагалоўі сьвіней 175.000 штук і сьвіноматак—50.000 на 1931 год. Плян укамплектаваньня выканан: па агульным пагалоўі—на 42 проц., па матках—на 56,5 проц. па пляне Сьвінавода, які менш нашага плану, выкананьне на 77 проц.

Па калгасных таварных фэрмах было запраектавана па агульным пагалоўі 300.000, па матачным — 100.000 і па таварнай прадукцыі — 37.800. На 10 лістапада арганізавана 1.600 фэрм, Плян укамплектаваньня па агульным пагалоўі выканан на 44 проц., па сьвіноматках—на 73 проц. і па здачы таварнай прадукцыі — на 28 проц.

Гаворачы аб вялізарным значэньні, якое набывае задача вырашэньня жывёлагадоўчай праблемы, зьезд партыі павінен даць дырэктывы ўсёй КП(б)Б і ЦК партыі, каб 1932 год быў годам рашаючым у сэнсе вырашэньня гэтай праблемы, у сэнсе ўзьняцьця нашай жывёлагадоўлі да ўзроўню запатраба ваньняў, якія прад'яўляюцца ўсім сацыялістычным будаўніцтвам, каб 1932 год быў годам практычнага павароту ўсёй КП(б)Б і паасобных яе зьвеньняў да практычнага вырашэньня задач, зьвязаных з разьвіцьцём жывёлагадоўлі.

У гэтым напрамку мы павінны рашучым чынам правесьці барацьбу са стратамі, аб чым я прыводзіў факты, рашуча правесьці барацьбу з разбазарваньнем жывёлы, асабліва маладняка (маладняк будзе адыгрываць рашаючую ролю ў выкананьні плянаў укамплектаваньня стада, у папаўненьні агульнага пагалоўя, якое вызначана кантрольнымі лічбамі на 1932 г.); павесьці кармовую базу пад жывёлагадоўлю, укараніць зоатэхніку, узмацніць кадрамі ўсе галіны сельскай гаспадаркі і арганізацыі, якія зьвязаны з вырашэньнем жывёлагадоўчай праблемы. Неабходна значна ўзьняць племянную справу, узьняць прадукцыйнасьць нашай жывёлы. Усяго гэтага з посьпехам можна дасягнуць, калі мы поўнасьцю ажыцьцявім на практыцы 6 умоў тав. Сталіна.

Мы павінны зьвярнуць асабліва сур'ёзную ўвагу на выкананьне саўгасамі і калгасамі абавязкаў па здачы таварнай прадукцыі дзяржаве. Мы маем факты распаўсюджаньня ў радзе саўгасаў і калгасаў месьцішчых спажывецкіх настрояў такога парадку: «Перш за ўсё сабе, а потым дзяржаве». Мы маем факты разбазарваньня жывёлы, часты забой пад выглядам «чумы». Усё гэта і ёсьць злачынныя адносіны да здачы таварнай прадукцыі дзяржаве.

Другое пытаньне, зьвязанае з далейшым напрамкам разьвіцьця ўсёй нашай сельскай гаспадаркі, гэта—разьвіцьцё тэхнічных культур. Я ўжо пры вёў адпаведныя факты ўсё ўзрастаючай ролі тэхнічных культур у пасевах. Мы мелі ў 1931 годзе 240.000 гэкт. пасеву ільну і 31.000 гэкт. канапель. На 1932 год вызначана 320.000 гэкт. Наш напрамак, наша лінія і на далейшы час характарызуюцца яшчэ больш моцным разьвіцьцём тэхнічных культур.

Асабліва вялікае значэньне набывае ўзьняцьце ўраджайнасьці ільну і канапель. Тут мы адсталі ад заходня-эўрапэйскіх краін. У бліжэйшыя 1932 і 33 гады мы павінны абкульцівіць рад такіх мерапрыемстваў, каб у 2-3 разы павялічыць ураджайнасьць і палепшыць якасьць прадукцыі нашых тэхнічных культур.

Канкрэтныя мерапрыемствы па разьвіцьці тэхкультур, побач з вырашэньнем праблемы жывёлагадоўлі, павінны заняць важнейшае месца пры складаньні пляну другой пяцігодкі.

— Таварышы! Адно з пытаньняў, якое набывае выключнае значэньне ў галіне разьвіцьця сельскай гаспадаркі, гэта—мэлярацыя. Забалочанай плошчы ў нас 2.160 тыс. гэкт. Асабліва забалочаньне мы маем на Прыпяці, Бярэзіне, Дняпры, Нёмане і г. д. Вопыт ужо даказаў, што разьвіцьцё ў нас мэлярацыі — праблема вялікага гаспадарча-палітычнага значэньня. Тое, што мы ўжо маем у разгортваньні лугавой гаспадаркі і пасеўных траў, паказвае вялікую ўраджайнасьць, пераважнасьць балотных масываў над агульнымі масывамі. Ужо даказана, што пасеў тэхнічных культур на балотных масывах значна перавышае ўраджайнасьць звычайных масываў. Перад намі, такім чынам, стаіць задача разгортваньня мэлярацыі, як адзэй з вялізарных гаспадарча - палітычных праблем у разьвіцьці і рэканструкцыі сельскай гаспадаркі Беларусі.

ЦК у апошні час займаўся спэцыяльна гэтым пытаньнем, паставіў гэта пытаньне ў ЦК УсеКП(б) і ў адпаведных нашых цэнтральных установах.

Мы лічым неабходным оканцэнтраваць асаблівую ўвагу на разьвіцьцё мэлярацыі ў такіх раёнах, як Палесьсе, Мазыршчына. Выкарыстаць прыродныя багацьці гэтых раёнаў — наша неадкладная задача. Ад пасьпяховага вырашэньня яе ў значнай меры будзе залежаць ліквідацыя адсталасьці гэтых раёнаў. Наогул мы павінны паставіць задачу, каб у хутчэйшы час падцягнуць так званыя «глухія» раёны, напрыклад, Лельчыцкі, Чырвонапольскі і некаторыя іншыя. Для гэтага ў першую чаргу мы павінны выкарыстаць прадукцыйныя сілы, якія хаваюцца ў нетрах зямлі. Мэлярацыя становіцца адной з важнейшых задач, над вырашэньнем якой мы павінны працаваць.

Вось гэтыя праблемы павінны быць высунуты і ў дырэктывах па дакладу ЦК партыі і знайсьці сваё практычнае вырашэньне.

Гаворачы аб рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, мы адначасова павінны ў далейшых дырэктывах па пытаньні ўзьняцьця ўраджайнасьці і ўкараненьня апратэхнікі даць наступныя паказаньні: па-першае, узьняць на значную палітычную вышыню гэта пытаньне сярод усёй партыйнай арганізацыі, ма білізаваць яе на ажыцьцяўленьне гэтай задачы і правесьці рад практычных мерапрыемстваў, зьвязаных са скліканьнем зьезду, з агульнай пастаноўкай агітацыі, прапаганды, шырокай масава-растлумачальнай работы.

Вялізарнейшае значэньне набывае пытаньне ўзьняцьця ўраджайнасьці і ўкараненьня апратэхнікі ў сельскую гаспадарку, што зьяўляецца важнейшым у сэнсе далейшага павышэньня таварнасьці сельскай гаспадаркі.

У справе правядзеньня ўсіх мерапрыемстваў па рэканструкцыі сельскай гаспадарцы мы ні ў якім разе не павінны недаацэньваць аднаасобны сэктар, памятаючы, што ён яшчэ займае значнае месца. Мы павінны весьці рашучую барацьбу з ігнараваньнем аднаасобнага сэктару, мы павінны мабілізаваць беднякa і серадняка—адну асобніка на выкананьне як агульных задач, так і ў сэнсе далейшага ўзьняцьця таварнасьці сельскай гаспадаркі.

Усе пытаньні, зьвязаныя з рэканструкцыяй сельскай гаспадаркі, з узьняцьцем ураджайнасьці і правядзеньнем іншых мерапрыемстваў, адначасова маюць дачыненьне і да бальшавіцкага правядзеньня надыходзячай веснавой пасеўнай кампаніі.

Канкрэтны плян работы быў дан у разгорнутым выглядзе ў пастанове ЦК і СНК, якая ня так даўно была апублікавана (мерапрыемствы па пасеўнай кампаніі на 1932 год.). Трэба, каб мы па-сапраў

XIV ЗЬЕЗД КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (БАЛЬШАВІКОЎ) БЕЛАРУСІ

Цэнтральнаму Камітэту Ўсесаюзнай Камуністычнай Партыі (бальшавікоў)

Арганізатару пераможнага сацыялістычнага наступленьня — ленінскаму Цэнтральнаму камітэту Ўсесаюзнай камуністычнай партыі (бальшавікоў) —XIV зьезд камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі шле баявое бальшавіцкае прывітаньне.

Пад сьцягам Леніна КП(б)Б, якая кіруецца Цэнтральным камітэтам УсеКП(б), на чале з тав. Сталіным,— прышла да XIV зьезду і XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі з вялізарнымі дасягненьнямі на ўсіх франтах гаспадарчага і нацыянальна-культурнага будаўніцтва.

Пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі пралетарыят і працоўныя БССР у непарыўным яднаньні з пралетарыятам і працоўнымі масамі ўсяго Савецкага Саюзу пасьпяхова выканалі задачу 3-га году пяцігодкі і прыступілі да ажыцьцяўленьня задач чацьвертага—завяршальнага году пяцігодкі. Вызначаючы праграмы набудовы сацыялізму, праграму другой пяцігодкі,— Савецкі Саюз, які кіруецца ленінскай партыяй, падышоў шчыльна да вырашэньня асноўнай палітычнай задачы — задачы канчатковай ліквідацыі капіталістычных элемэнтаў і клясаў наогул, поўнае зьнішчэньня крычын, якія параджаюць клясавую розьніцу і эксплёатацыю і перамаганьня перажытку капіталізму ў эканоміцы і сьвядомасьці людзей, ператвараньня ўсяго працоўнага насельніцтва краіны ў сьвядомых і актыўных будаўнікоў бясклясавага грамадзтва.

З царскай паўкалёніі, якая эксплёатавалася, ніпісьменнай акраіны Расіі—гэтай турмы народаў—Савецкая Беларусь ператвараецца ў краіну разгорнутага сацыялістычнага будаўніцтва, у краіну сацыяльнай пісьменнасьці, у краіну, якая стварае культуру нацыянальную па форме і сацыялістычную па зьмесьце.

Усе гэтыя посьпехі намі дасягнуты ў непрымірымым змаганьні з ухілам ад генэральнай лініі партыі, з правым апартунізмам—галоўнай небясьпекай на даным этапе, «левымі» загібамі; гэтыя посьпехі дасягнуты ў барацьбе з контрэвалюцыйным троцкізмам, які стаў перадавым атрадам контрэвалюцыйнай буржуазіі, «Правда», пад кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б), да канца выкрыла перад усёй партыяй і шырокімі масамі пралетарыяту кулацкую, капіталістычную ідэалёгію правага апартунізму—галоўнай небясьпекі на даным этапе, выкрыла супраціўленьне «левых» загібаў. Мабілізуючы партыйныя масы на барацьбу супроць правых і «левых» апартуністаў, «Правда» жорсткага біла па беспрынцыпным прымірэнцтве, па гнілых ліберальных адносінах да ўхілаў ад бальшавізму.

КП(б)Б, пад сьцягам Леніна, няўхільна праводзячы ў жыцьцё генэральную лінію партыі, ажыцьцяўляючы ленінскую нацыянальную палітыку ў барацьбе на два фронты, дабілася буйнейшых посьпехаў на ўсіх участках сацыялістычнага будаўніцтва Савецкай Беларусі. Зьезд падкрэсьлівае, што ў гэтых посьпехах вялікія заслугі належаць бальшавіцкай «Правде», якая, пад кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б), разьвіваючы на справе бальшавіцкую самакрытыку, мабілізуючы партыйныя арганізацыі на барацьбу супроць усякіх праяўленьняў апартунізму, дапамагла ажыцьцяўленьню задач сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР.

Мабілізуючы масы на пасьпяховае завяршэньне пяцігодкі за чатыры гады, «Правда», пад кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б) будзе і надалей пастоянна змагацца за «канчатковую ліквідацыю капіталістычных элемэнтаў і клясаў наогул, поўнае зьнішчэньне крычын, якія параджаюць клясавую розьніцу і эксплёатацыю, і перамаганьне перажытку капіталізму ў эканоміцы і сьвядомасьці людзей, ператвараньня ўсяго працоўнага насельніцтва краіны ў сьвядомых і актыўных будаўнікоў бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва».

Няхай жыве вострая зброя партыі, арганізатар мас у барацьбе за сацыялістычныя перамогі—бальшавіцкая «Правда».

Няхай жыве ленінскі ЦК УсеКП(б) —баявы штаб разгорнутага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце!

Няхай жыве правадыр партыі і пралетарыяту—тав. Сталін.

Цэнтральнаму органу УсеКП(б)—газэце „Правда"

Цэнтральнаму органу УсеКП(б)— ленінскай «Правде» ад XIV зьезду КП(б) Беларусі гарачае бальшавіцкае прывітаньне.

Верная прынцыпам ленінізму, «Правда» пад выпрабаваным кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б), да канца выкрыла партыі тав. Сталіна, аб'яднаўшися і аб'яднаўшися непрымірымым барацьбітом за чыстату генэральнай лініі, баявым арганізатарам мас на пасьпяховае правядзеньне і забесьпячэньне бальшавіцкіх тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Разграміўшы троцкізм, які стаў перадавым атрадам контрэвалюцыйнай буржуазіі, «Правда», пад кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б), да канца выкрыла перад усёй партыяй і шырокімі масамі пралетарыяту кулацкую, капіталістычную ідэалёгію правага апартунізму—галоўнай небясьпекі на даным этапе, выкрыла супраціўленьне «левых» загібаў. Мабілізуючы партыйныя масы на барацьбу супроць правых і «левых» апартуністаў, «Правда» жорсткага біла па беспрынцыпным прымірэнцтве, па гнілых ліберальных адносінах да ўхілаў ад бальшавізму.

КП(б)Б, пад сьцягам Леніна, няўхільна праводзячы ў жыцьцё генэральную лінію партыі, ажыцьцяўляючы ленінскую нацыянальную палітыку ў барацьбе на два фронты, дабілася буйнейшых посьпехаў на ўсіх участках сацыялістычнага будаўніцтва Савецкай Беларусі. Зьезд падкрэсьлівае, што ў гэтых посьпехах вялікія заслугі належаць бальшавіцкай «Правде», якая, пад кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б), разьвіваючы на справе бальшавіцкую самакрытыку, мабілізуючы партыйныя арганізацыі на барацьбу супроць усякіх праяўленьняў апартунізму, дапамагла ажыцьцяўленьню задач сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР.

Мабілізуючы масы на пасьпяховае завяршэньне пяцігодкі за чатыры гады, «Правда», пад кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б) будзе і надалей пастоянна змагацца за «канчатковую ліквідацыю капіталістычных элемэнтаў і клясаў наогул, поўнае зьнішчэньне крычын, якія параджаюць клясавую розьніцу і эксплёатацыю, і перамаганьне перажытку капіталізму ў эканоміцы і сьвядомасьці людзей, ператвараньня ўсяго працоўнага насельніцтва краіны ў сьвядомых і актыўных будаўнікоў бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва».

Няхай жыве вострая зброя партыі, арганізатар мас у барацьбе за сацыялістычныя перамогі—бальшавіцкая «Правда».

Няхай жыве ленінскі ЦК УсеКП(б) —баявы штаб разгорнутага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце!

Няхай жыве правадыр партыі і пралетарыяту—тав. Сталін.

Зьезду камуністычнай партыі Беларусі

Менск, ЦК КП(б)Б

Заходняя абласная партканфэрэнцыя шле гарачае прывітаньне бальшавіком Беларусі. Як і ўся партыя бальшавікоў Беларусі, пад ленінскім кіраўніцтвам ЦК і правадыра партыі тав. Сталіна прышла да свайго партыйнага зьезду з вялікімі посьпехамі па сацыялістычным будаўніцтве ў Беларусі. Жадаем бальшавікам Беларусі далейшых посьпехаў і новых перамог ў будаўніцтве сацыялізму.

Няхай жывуць бальшавікі Беларусі!

Няхай жыве ЦК і правадыр партыі тав. Сталін!

Прэзыдыум трэцяй заходняй абласной партканфэрэнцыі

Прывітаньне ад XIV зьезду КП(б)Б--ЦК КПП і ЦК КПЗБ

Кіраўніку надыходзячых рашучых баёў за польскі Кастрычнік, барацьбіту з крывавым фашызмам, правадыру нацыянальна-вызваленчай барацьбы супроць польскай акупацыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, загартаванаму ў падпольнай рабоце—Цэнтральнаму Камітэту брацкай камуністычнай партыі Польшчы і Цэнтральнаму Камітэту Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі—XIV зьезд КП(б)Б шле палкае бальшавіцкае прывітаньне.

Дарагія таварышы. Да свайго XIV зьезду КП(б)Б прышла маналітна загартаваным атрадам бальшавікоў-ленінцаў з вялікімі дасягненьнямі на шмат лёгкіх франтох сацыялістычнай будоўлі. Савецкая Беларусь з паўкалёніі царскай Расіі ператвараецца ў індустрыяльна-аграрную краіну, маючы на сёння ўжо амаль 100-тысячную армію фабрычнага пралетарыяту.

Бядняцка-серадняцкія масы БССР даказалі сваю адданасьць справе сацыялізму, аб'яднаўшы дробна-ўласьніцкія гаспадаркі ў калгасы больш чым на 50 проц. У гэтай вялізарнай будоўлі працоўныя ўсіх нацыянальнасьцей, пад кіраўніцтвам партыі, ідуць непахіснымі радамі да новых перамог пад сьцягам Леніна.

Пад гэтым-жа сьцягам яны, пад кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б ствараюць сваю культуру нацыянальную па форме і пралетарскую па зьмесьце, вядучы барацьбу за ператварэньнеБССР у гэтым-жа годзе ў краіну суцэльнай пісьменнасьці.

Пралетары і працоўныя беларускай, польскай, яўрэйскай, літоўскай і латыскай нацыянальнасьцяй паказваюць лепшыя ўзоры творчага энтузіязму ў справе будаўніцтва сацыялістычнай гаспадаркі і сваёй нацыянальнай культуры. Яны ствараюць сваю пралетарскую нацыянальную культуру на рубяжы з крайнай фашызму, з крайнай шыбеніц і палявых судоў, з крайнай голаду і нацыянальнага прыгнечаньня.

Ва ўсёй гэтай барацьбе і будаўніцтве мы ні на хвіліну не забываем таго, што наша работа ёсьць частка агульна-пралетарскай справы барацьбы за сусьветны Кастрычнік. За нашу работу, за кожны посьпех у ёй і за кожны недахоп мы адказваем і перад пралетарыямі Польшчы і пралетарыямі Заходняй Беларусі, якія пад кіраўніцтвам КПП і КПЗБ рыхтуюцца да апошніх баёў з капіталам, з крывавым фашызмам, з акупацыяй, польскім імпэрыялізмам Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Нашы посьпехі магчымы толькі таму, што нас натхняе сьвядомасьць таго, што наша будаўніцтва ёсьць база сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі, наша будаўніцтва абумоўлена непарыўнай сувязьзю з вашай барацьбой з прыгнятальнікамі, якім вы наносіце ўдар за ўдарам, зрываючы ажыцьцяўленьне іх інтэрвэнцыяністкіх плянаў.

Памятаючы аб супольнай барацьбе польскага, беларускага і яўрэйскага пралетарыяту супроць паноў і капіталістаў у часы царызму, праводзячы барацьбу за справу Леніна, пад кіраўніцтвам Камінтэрну ў апошнія часы,— мы разам з вамі ідзем ўперад да новых перамог, да сусьветнага Кастрычніка пад сьцягам Леніна, пад сьцягам Камінтэрну.

Гэты наш шлях вызначан ленінізмам, як перадавой рэвалюцыйнай тэорыяй, за якую мы зводзем непрымірымую барацьбу супроць правага апартунізму, «левага» ўхілу, супроць контрэвалюцыйнага троцкізму, супроць ня-ліквідацыйнага ўхілу, як галоўнай небясьпекі, супроць нацыянал-апартунізму і прымірэнцтва. У гэтай барацьбе ліст правадыра партыі і Камінтэрну тав. Сталіна зьяўляецца вострай зброяй у руках партыі.

Пад кіраўніцтвам Камінтэрну і правадыра міжнароднага пралетарыяту тав. Сталіна вы ідзеце па шляху да свайго Кастрычніка, у непрымірымай бязьлітаснай барацьбе супроць люксэмбургіянства і меншавіцкіх традыцый «ППС Лявіцы», за ленінізм, сьцягнога вы з гонарам прынясеце да сусьветнага Кастрычніка.

Няхай жыве Камінтэрн—правадыр сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі!

Няхай жыве правадыр сусьветнага пралетарыяту—тав. Сталін!.

Няхай жыве Кастрычнік Польшчы і Заходняй Беларусі!

Няхай жыве баявы атрад Камінтэрну Камуністычная Партыя Польшчы!

Няхай жыве Камуністычная партыя Заходняй Беларусі—правадыр барацьбы за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне нашых кроўных братоў—працоўных мас Заходняй Беларусі!

Маскоўскай абласной і гарадзкой партыйнай канфэрэнцыі

Бальшавіком сталіцы сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі—Маскоўскай абласной і гарадзкой партыйнай канфэрэнцыі ад XIV зьезду КП(б) Беларусі гарачае камуністычнае прывітаньне!

Маскоўская арганізацыя якая працуе пад выпрабаваным бальшавіцкім кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б), паказвае ўсёй партыі бліскучыя ўзоры барацьбы за пабудову сацыялізму. Маскоўская арганізацыя бальшавіцкімі тэмпамі ажыцьцяўляе указаньні правадыра партыі тав. Сталіна і пастановы пленуму ЦК УсеКП(б) аб ператварэньні Масквы ва ўзорную пралетарскую сталіцу. На аснове выкананьня 6 умоў тав. Сталіна ў прамысловасьці і ў сельскай гаспадарцы, у барацьбе за севецкі аўтамабіль, ільна-церабілку, паравоз, электраабсталяваньне і тэкстыль, у барацьбе за лён і хлеб пралетары і калгасьнікі Масквы і Маскоўскай вобласьці ідуць у першых радох барацьбітоў за ажыцьцяўленьне пяцігодкі за чатыры гады.

Змагаючыся за пабудову сацыялістычнага грамадзтва, за выкананьне гістарычных задач 2-й пяцігодкі, змагаючыся за ператварэньне ўсяго працоўнага насельніцтва краіны ў сьвядомых і актыўных будаўнікоў бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва, Маскоўская парт'арганізацыя, пад кіраўніцтвам аднаго з лепшых вучняў Леніна — Сталіна—тав. Кагановіча— верная апора ленінскага ЦК УсеКП(б) —і далей будзе ў першых радох партыі, з ленінскай непрымірымасьцю змагацца за генэральную лінію, супроць правых і «левых» апартуністаў.

Няхай жыве Маскоўская канфэрэнцыя УсеКП(б)!

Няхай жыве ЦК УсеКП(б)!

Няхай жыве правадыр нашай партыі тав. Сталін!

Заходняй абласной канфэрэнцыі камуністычнай партыі

Бальшавіком Смаленшчыны, авангарду сацыялістычнага будаўніцтва Заходняй вобласьці ад XIV зьезду КП(б) Беларусі камуністычнае прывітаньне.

Пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК УсеКП(б) на чале з правадыром партыі т. Сталіным, замацоўваючы дасягнутыя посьпехі, неаслабна змагаючыся за чыстату вучэньня Леніна, бальшавікі Заходняй вобласьці пойдуць да новых посьпехаў будаўніцтва сацыялізму ў другую пяцігодку, штурмуючы ўсе труднасьці, якія стаяць на нашым шляху. За пасьпяховае завяршэньне пяцігодкі за чатыры гады, за сацыялізм, за ўсямерную перамогу пралетарскай рэвалюцыі.

Няхай жывуць бальшавікі Заходняй вобласьці!

Няхай жыве ЎсеКП(б) і яе ленінскі ЦК!

Няхай жыве правадыр партыі тав. Сталін!

Прэзыдыум зьезду КП(б)Б

Фінансавы паход

50 проц. квартальнага пляну--да XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі!

Пераходны сьцяг ЦСПСБ—Гомелю

Пастанова Прэзыдыуму ЦСПСБ аб уручэньні пераходнага сьцягу ЦСПСБ—за мабілізацыю фінансавых сродкаў

Прэзыдыум ЦСПСБ адзначае:

1) што гарады Менск, Гомель, Віцебск, Магілеў і раёны Сіроцінскі, Заслаўскі, Асіпавіцкі, Касьцюковіцкі і рад інш. шырока разгарнулі масавую і арганізацыйную работу па мабілізацыі шырокіх рабочых і калгасных мас на падставе рэалізацыі шасьці ўмоў т. Сталіна, праз правядзеньне фінансавай эстафэты, грамадзкага буксіру— забясьпечылі рашучы пералом у справе выкананьня фінпляну 3-га рашаючага году.

2) ГПС Менску, Гомелю, Віцебску разгарнулі бальшавіцкія тэмпы барацьбы за выкананьне фінпляну, узначалілі мабілізацыю рабочых мас і забясьпечылі перавыкананьне плянавых заданьняў, асабліва па дабраахвотных плацяжох, зьявіліся ініцыятарамі і арганізатарамі правядзеньня новых форм работы, забясьпечыўшы актыўную ролю шэфствуючых заводаў над Гарфо (дасылка буксірных брыгад у іншыя адстаючыя раёны).

Выходзячы з вышэйпаказанага Прэзыдыум ЦСПСБ пастанаўляе:

1. За ўдарную работу па мабілізацыі рабочых мас на выкананьне пляну мабілізацыі фінансавых сродкаў, на ўкарананьне новых форм і мэтадаў працы, якія забясьпечылі сыстэматычнае з кварталу ў квартал нарастаньне тэмпаў у выкананьні фінпляну, за ўзорнае разгортваньне масавай работы па выкананьні фінпляну ўручыць пераходны сьцяг ЦСПСБ Гомельскаму Гарпрафсавету.

2. Адзначыць работу ЦП саюзаў Машынабудаўніцтва, Працасьветы і асабліва праяўленую ініцыятыву ЦП саюзу фін. банк. работнікаў.

3. Адзначыць, што Расонскі, Чэрвеньскі, Гарадоцкі, Глускі, Чырвонапольскі, Лоеўскі, Ельскі і Нараўлянскі РПС праявілі бязьдзейнасьць і нездольнасьць у справе мабілізацыі шырокіх мас рабочых і калгасьнікаў на выкананьне пляну і дырэктыў ЦК КП(б)Б і ЦСПСБ і ганебнае адставаньне паказаных раёнаў у выкананьні фінпляну,—Прэзыдыум ЦСПСБ папярэджвае гэтыя раёны, што далейшая адсутнасьць належнага пералому ў бліжэйшыя дні пацягне прыняцьце арганізацыйных мер узьдзейнічаньня.

Прэзыдыум ЦСПСБ прапануе ўсім прафарганізацыям узяць прыклад і скарыстаць вопыт працы на выкананьне фінпляну 1931 г. з перадавых раёнаў Гомельскага, Менскага, Віцебскага, Сіроцінскага, Заслаўскага, Асіпавіцкага, Жыткавіцкага і разгарнуць арганізацыйна-масавую работу ў напрамку поўнага выкананьня пляну і сыстэматычнага нарастаньня тэмпаў з дэкады ў дэкаду, з кварталу ў квартал у 1932 годзе.

т. Мяшалаў, ударнік фінансавага фронту.

Прэміі ўдарнікам фінансавага фронту

БАРЫСАЎ. 23-I. (Белта). У выніку разгортваньня сацспаборніцтва ў правядзеньні фінэстафэты паасобныя арганізацыі і сельсаветы выканалі і перавыканалі заданьне па мабілізацыі сродкаў на IV квартал 1931 г. Так, прамысловая кааперацыя выканала кіраванае заданьне IV кварталу на 230 проц., ЦРК і ЗРК па паявых узносах—на 297 проц. Не адстае і жыльлёвая кааперацыя, якая па паявых узносах выканала сваё заданьне на 104,3 проц. Зембінскі местачковы савет, Лозінскі і прыгарадны сельсаветы выканалі поўнасьцю заданьне па абавязковых плацяжох. Усе гэтыя арганізацыі пленумам РВК занесены на чырвоную дошку. Старшыні Зембінскага местачковага савету пленум РВК пастанавіў выдаць прэмію ў суме 100 руб. Прэм'яваны таксама старшыня Азьдзяціцкага сельсавету т. Хадачэвіч, Бытчанскага сельсавету тав. Маўчанскі, Неманіцкага сельсавету тав. Мамічаў, Зембінскага сельсавету тав. Дудзіцкі, В-Незнаўскага тав. Хадасэвіч, К-Слабодзкага тав. Саналоўскі і інш.

За выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў паасобнымі калгасамі прэм'яваны старшыня калгасу «Перадавік» тав. Шакавец, «Чырвоная Зорка» тав. Круглік, «Ударнік»—тав. Дубень, «Шлях Сацыялізму» тав. Макалыга, «Бальшавік»—тав. Паўлавец, і старшыня калгасу «Дружны Труд».

Побат з гэтымі посьпехамі ў выніку правапартыйстычнай недаацэнкі справы мабілізацыі сродкаў, рад арганізацый ф сельсаветаў ня выканалі заданьне IV кварталу. Так, райашчадкаса выканала заданьне па фізычных укладах толькі на 30,6 проц., райспажыўсаюз па паявых узносах—на 38,1 проц., райкалгасаюз—на 50,4 проц.

Для забесьпячаньня 100 процантнага выкананьня студзеньскага заданьня па мабілізацыі сродкаў і 50 проц. квартальнага заданьня да XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі, пленум РВК вызначыў шэсьць маршрутаў па правядзеньні фінансавага паходу.

Фінплян будзе выкананы

ЦК КП(б)Б, ЦВК, СНК БССР, НКФ БССР

Зьлёт ударнікаў фінансавага фронту Заслаўшчыны, падводзячы вынікі работы па выкананьні фінпляну ў 3-м рашаючым, запэўнівае партыю і ўрад, што пад кіраўніцтвам партыі, на аснове шырокага разгортваньня масавай работы, сацспаборніцтва і ўдарніцтва—фінплян 1 кварталу і ўсяго 4-га заключнага году пяцігодкі будзе выкананы.

ПРЭЗЫДЫУМ ЗЬЛЁТУ ЎДАРНІКАЎ ФІНАНСАВАГА ФРОНТУ ЗАСЛАЎШЧЫНЫ.

Выканаем фінплян 1 кварталу ў вызначаны тэрмін

Рэдакцыі газэты „Савецкая Беларусь" і 1-й Усебеларускай канфэрэнцыі фінбанкаўскіх работнікаў

РАПАРТ

Мазырскі РМК саюзу фінбанкаўскіх работнікаў рапартуе, што пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі Мазырскага РК КП(б)Б і РВК на 20-І студзеньскі фінплян па горадзе выкананы на 117,6 проц., па раёне—101,7 пр.

РМК саюзу фінбанкаўскіх работнікаў Мазырчыны заверае XIV партыйны зьезд КП(б)Б, 1-ую Усебеларускую канфэрэнцыю саюзу фінбанкаўскіх работнікаў, што і ў далейшым не здадуць тэмпаў і будуць па-бальшавіцку змагацца за 100 проц. выкананьне ўсяго фінансавага пляну 1932 году.

Старшыня Мазырскага РМК ФБР Галубіцкі.

Рапарт

Менгарскому КП(б)Б, Менгарсавету, Менгарпрафсавету і ЦП саюзу фінбанкаўскіх установ

Плян мабілізацыі сродкаў па Менскім Аддзяленьні Дзяржбанку за студзень месяц, у суме 350.000 руб., мэтадамі сацспаборніцтва і ўдарніцтва выкананы 25-І датэрмінова на 100 проц.

Запэўняем, што прыкладзем усю энэргію, каб пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі выканаць датэрмінова квартальны плян мабілізацыі сродкаў.

Кір. Менскага Аддзяленьня Дзяржбанку Кейлін.
Сакратар партячэйкі Байрашэўскі.
Ст. Мясцкому Іваноўская.

У радох пераможцаў.

Гомель выканаў студзеньскі фінплян

ГОМЕЛЬ. 23-І. (Белта). У выніку шырока разгорнутай масавай работы пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый, студзеньскае заданьне па мабілізацыі сродкаў выканана на 101 проц., на 10 дзён раней тэрміну.

Рабочыя фабрыкі «Чырвоны Кастрычнік» у падарунак II-й гарадзкой партканфэрэнцыі і XIV зьезду КП(б)Б выканалі квартальнае заданьне па ўкладах у ашчадкасу на 107 проц.

Неадкладна ліквідаваць прарыў

Плян збожжазагатовак па Шацілаўскім сельсавеце, Парыцкага раёну, выканаў на 60 проц.

Такое адставаньне тлумачыцца тым, што сельсавет і партыйныя ячэйкі не праводзяць ніякай масава-палітычнай работы сярод калгасьнікаў і адпасобнікаў—беднякоў і сераднякоў.

Паасобныя партыйцы тлумачаць сваю бязьдзейнасьць у справе збожжазагатовак тым, што «няма часу».

Бязумоўна, такой пасыўнасьці павінен быць пакладзены канец.

Справа барацьбы за збожжа—справа кожнага партыйца, камсамольца, калгасьніка, бедняка і серадняка-адпасобніка.

Брыгада газ. «Сав. Бел.»: Вайнштэйн і Паперча

Г. Брынев'ч

Школа на ўздыме

«Няма такіх крэпасьцей, якіх бальшавікі не маглі-б узяць. Мы вырашылі рад цяжкіх задач. Мы скінулі капіталізм. Мы ўзялі ўладу. Мы пабудавалі буйнейшую сацыялістычную індустрыю. Мы павярнулі серадняка на шлях сацыялізму. Самае важнае з пункту гледжаньня будаўніцтва, мы ўжо зрабілі. Нам засталося нямногае: вывучыць тэхніку, аўладаць навукай. Калі мы зробім гэта, у нас пойдуць такія тэмпы, аб якіх цяпер мы ня можам і марыць. І мы гэта зробім, калі захочам гэтага па савраўднаму» (Сталін).

Ва ўмовах сацыялістычнага будаўніцтва складаюцца зусім новыя магчымасьці для скарыстаньня дасягненьняў навукі і тэхнікі, шляхам высока-тэхнічнага ўзбраеньня працы на заводах, фабрыках, саўгасах, калгасах.

Акадэмік Струмілін даводзіць, што адна толькі машынная апрацоўка зямлі ў калгасах і ўжываньне трактароў і камбайнаў скарачае патрабаваньні ў рабочай сіле ў 17 раз, а ў працэсе ўборкі хлеба камбайнамі, нават у 90 раз.

Сучасная тэхніка зводзіць рамесьніцкую кваліфікацыю дашчэнту. Мэханізацыя зьмяняе характар падрыхтоўкі рабочых кадраў. Асаблівую ролю на вытворчасьці набываюць рабочыя, якія аўладаюць сучаснай тэхнікай працы. Аўладаньне новай тэхнікай—вялізарная задача, адсюль падрыхтоўка праз школу, курсы усебаго за разьвітых будаўнікоў сацыялізму, якія ўпершыню ў школе ўвязваюць тэорыю з практыкай—гаспадарча-палітычная задача.

Маркс лічыць, што машына патрабуе спачатковай падрыхтоўкі рабочага. «Будучы яшчэ дзіцём, ён лягчэй ўсяго навучыцца ўзгадняць свае ўлас ныя рухі з аднастайна-непарыўнымі рухамі аўтамата... Тая шпаркасьць, з якой чалавек у юнацкім узросьце на вучаецца працаваць у сваю чаргу ад хіліе неабходнасьць вытрацоўкі асобнай клясы рабочых выключна машынных рабочых».

Да гэтага часу наша школа і мноція зьвяньні сыстэмы нарасьветы ўсё яшчэ ў значнай ступені адарваны ад задач вытворчасьці, ад задач сацыялістычнага будаўніцтва; не даюць не абходных ведаў вучню, студэнту. Таму наша задача зараз падняць якасьць вучобы, устанавіць больш моцную сувязь на ўсіх ступенях культурнага будаўніцтва паміж культурнай работай і запатрабаваньнямі гаспадаркі.

«У сувязі з задачай падрыхтоўкі кадраў масавай кваліфікацыі і падвышэньня культурна-палітычнага ўзроўню працоўных, неабходна дабіцца пагалоўнага ахопу рабочых і калгасьнікаў сыстэмай масавай асьветы, дадатковага і завочнага навучаньня ў выгляде разнастайных школ і курсаў, рабочых і калгасных унівэрсытэтаў, прыстасаваных да запатрабаваньняў разнастайным па сваёй падрыхтоўцы і запытаньням груп рабочых і калгасьнікаў да ўмоў вытворчасьці» (з пост. ЦК УсеКП(б) ад 27-VIII—30 г.).

Рашэньне ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб пачатковай і сярэдняй школе зьяўляецца разгорнутай праграмай барацьбы за палітэхнічную школу ў шырэйшы будаўніцтва сацыялізму.

Савецкая школа за апошнія гады, дабілася значных посьпехаў:

а) у школе «заложаны асновы перабудовы школы на базе палітэхнізму»;

б) «школа значна прасуналася ў аб'яднаньні тэорыі з вытворчай практыкай»;

в) «прынцыпова іншым стаў зьмест і ўся праца школы» (з пастановы ЦК УсеКП(б)).

Посьпехі ў сацыялістычным будаўніцтве прадвяцяюць вялізарнейшыя запатрабаваньні да нашае школы. У сьвеце дасягненьняў сацыялістычнага будаўніцтва недахопы школы асабліва яскрава вызначаюцца. У працэсе бурных тэмпаў росту савецкае палітэхнічнае школы меў месца цэлы рад памылак, антымаркасысцкіх, права-апартуністычных і «левацкіх» скажэньняў у тэорыі і практыцы школьнага будаўніцтва. Гэтыя памылкі спрычынілі пагыбленьню прарыву ў каранным недахопе школы. Апошні, ў даны момант, заключаецца ў тым, што «навучаньне ў школе не дае дасягнутага аб'ёму агульна-адукацыйных ведаў і нездаваньня ючя вырашае задачу падрыхтоўкі ў тэхнікумы і вышэйшую школу ўпаўне пісьменных людзей, добра ўладаючых асновамі навук (хімія, матэматыка, родная мова, геаграфія і г. д.) (з пастановы ЦК УсеКП(б) аб школе).

Гэты недахоп, прарыў тычыцца ня толькі нашай пачатковай школы, аль бо 7-годкі, ён, у аднолькавай ступені тычыцца і нашых курсаў, тэхнікумаў, ВНУ. Да рэчы, аб слабасьці агульна адукацыйных ведаў студэнтаў ВНУ раказваюць ледзь не анэкдоты: шмат студэнтаў у апошнія часы адказвалі, што Манчжурыя знаходзіцца ледзь не ў Бразыліі.

Да гэтага часу з аўладаньнем асноў навук справа абстаіць зусім нездавальняюча асабліва ў пачатковай і сярэдняй школе. Ласкутнасьць ведаў, паверхоўнасьць іх засваеньня, няўмень не прыстасоўваць іх да практыкі, няўменьне пісаць, лічыць; тысячы памылак, замест пісьма—каракулі; няведаньне гісторыі барацьбы рабочае кляасы. Ня гэтым вучастку аказаўся вялікі прарыў і гэты прарыў аказаўся вялікі памераў таму, што ў тэорыі і на практыцы будаўніцтва школы мелі месца буйныя памылкі ў выглядзе не дацэнкі значэньня агульнай адукацыі, у выглядзе адрыву палітэхнізацыі ад «усваеньня навук», а гэта выходзіла з тэорыі «адміраньня школы».

Нам неабходна з усёй рашучасьцю падкрэсьліць—палітэхнізацыя школы без падняцьця агульна-адукацыйных ведаў—скажэньне ленінскага разуменьня палітэхнізацыі.

Размах працы, матар'яльная база, тэмпы будаўніцтва, новыя запатрабаваньні, бязумоўна, оклалі важнейшыя падставы для барацьбы за якасьць працы.

Удзел рабочых, калгасьнікаў, адпасобнікаў, беднякоў і сераднякоў у масавым руху за ўсенавуч і палітэхнізацыю, прымацаваньне школы да прадпрыемстваў, калгасаў—усё гэта складала прадпасылкі для барацьбы за якасьць вучобы. Да сучаснага моманту на шляху ўзьняцьця якасьці савецкае школы, НКА і яго органамі на мясцох складзены асноўныя прадпасылкі для палепшаньня працы школ. Складзены новыя праграмы, якія пабудаваны па прадметах для ўсіх гадоў навучаньня ў мэтах забесьпячэньня ў кожнай дысцыпліне кола акрэсьленых ведаў. Праграмы матар'ял устанаўліваё сувязь тэорыі з практыкай, вучобу ў школе з вытворчай працай, вучобу ў школе з грамадзка-карыснай працай. Пры чым гэта аб'яднаньне праходзіць на аснове, калі ўся грамадзка-вытворчая праца вучняў падтрымлівала вучэбным і выхаваўчым мэтам школы.

Курс грамадазнаўства для 7-годкі падзяляецца на два самастойных прад меты: сыстэматычны курс гісторыі, па чынаючы яго з IV групы і грамадазнаўства (элемэнты палітэканоміі, эка номпалітэхніка, пытаньне сучаснасьці, сацбудаўніцтва і г. д.). Аб'ём ведаў па ўсіх прадметах павінен быць аднолькавы для ўсіх тыпаў школ, але дыфэрэнцыяваны па сваім рабочым матар'ялі, павінны быць праграмы па грамадазнаўству, прыродазнаўству, на літэхнічнай працы і матэматыцы.

Разгорнута работа па арганізацыі 160 узорных школ, палітэхнічных музэяў, майстэрняў, кінофікацыі і г. д., што павінна ў значнай ступені дапамагчы ў арганізацыі падтагічнага працэсу ў школе.

Вядзецца вялікая работа па ўпарад каванні ўнутранага жыцьця школы, па разгортваньні працы грамадзкіх інспэктуры і прапрацоўцы матар'ялу настаўнікамі масамі.

Зараз наша задача—дабіцца практычнага ўсваеньня настаўніцтвам новых праграм і для гэтага патрэбна вялізарнейшая работа сярод настаўніцтва. На мясцох неабходна скласьці, арганізаваць метадычныя нарады па асобных дысцыплінах, перабудова школы патрабуе ўчастай працы над новай мэтодыкай агульнай і прыватнай і яе патрэбна зараз-жа прасунуць у масы настаўніцтва, разгортваючы мэтадычнае кіраўніцтва, разгортваючы працу ўзорных школ, палітэхнічных музэяў, майстэрняў і г. д.

Патрэбна ўзьняць школьную дысцыпліну, узьняць агульны парадак у школе. Пад кіраўніцтвам партыі, усе сілы скіраваць на ліквідацыю карэннага недахопу школы і гэтым самым, склаўшы моцную базу для новага пад'ёму школы і яе перабудовы на падставе марксе-ленінскіх паказаньняў, у найкарацейшы тэрмін аўладаць метадычным бокам школьнае работы.

Шпаркія тэмпы будаўніцтва савецкай школы былі забесьпечаны толькі таму, што быў даны рашучы адпор праваапартуністычным і «левацкім» элемэнтам, якія скажалі ці адмаўлялі тэмпы будаўніцтва савецкай школы і самы зьмест палітэхнічнай школы. Барацьба за генэральную лінію партыі ў культурным будаўніцтве забясьпечылі посьпехі палітэхнічнай школы.

Дасягненьні, посьпехі ў прасоўваньні ўперад у будаўніцтве школы даюць матар'ял і рухаюць ўперад распрацоўку пралетарскае пэдагагічнае тэорыі. Пасьпяхова прасоўваецца ўперад у школьным будаўніцтва мы можам толькі пры дапамозе перадавой працетарскай пэдагагічнай тэорыі, бо толькі тэорыя, якая складаецца ў непарыўнай сувязі з рэвалюцыйнай практыкай «дае руху ўпэўненасьць, мод арыентоўкі і разуменьне ўнутранай сувязі акружаючых падзей» (Сталін).

Мы ведаем, што спрэчкі па пытаньнях бягучай палітыкі амаль заўсёды былі ў сваіх крыніцах тэарытычнымі спрэчкамі. У аснове практычных памылак у сацыялістычным гаспадарчым і культурным будаўніцтве заўсёды ляжалі скажэньні марксыцка-ленінскай тэорыі.

«Асноўнае зло правага апартуністу складаецца з таго, што ён разрываў з ленінскім разуменьнем клясавай барацьбы і ск

Пастанова бюро ЦК КП(б)Б аб прапрацоўцы тэзісаў XVII партыйнай канфэрэнцыі УсеКП(б)

ЦК КП(б)Б, надаючы вялізарнае палітычнае значэньне пытаньню давядзеньня тэзісаў XVII канфэрэнцыі УсеКП(б) да кожнага члена і кандыдата партыі, да кожнага камсамольца, рабочага і калгасьніка, прапануе ГК і РК КП(б)Б і фракцыям профсаюзаў адразу-жа разгарнуць шырокую масавую прапрацоўку гэтых тэзісаў шляхам правядзеньня наступных мерапрыемстваў:

1. Ва ўсіх парт'ячэйках і ячэйках ЛКСМБ як у гарадох, так і на вёсцы склікаць унечарговыя сходы для стадыі прапрацоўкі тэзісаў XVII партканфэрэнцыі УсеКП(б), надрукаваных у цэнтральных і беларускіх газэтах, ГК і РК КП(б)Б забясьпечыць дакладчыкамі, падрыхтаванымі вытрыманымі дакладчыкамі.

2. Прапанаваць ГК і РК КП(б)Б і фракцыям профсаюзаў склікаць агульныя сходы на прадпрыемствах, у саўгасах і калгасах, у апорных пунктах на вёсцы (сельпарткомы) з пастаноўкай дакладу аб тэзісах XVII партыйнай канфэрэнцыі, высьвятляючы іх сусьветнае гістарычнае значэньне. Скарыстаць таксама абедзеньны перапынкі для масавай работы вакол тэзісаў работы. Правядзеньне ўсёй гэтай работы забясьпечыць вытрыманымі, падрыхтаванымі работнікамі.

3. Культпропу ЦК КП(б)Б забясьпечыць шырокае асьвятленьне ў цэнтральным, гарадзкім, раённым і нізавым друку тэзісаў XVII канфэрэнцыі УсеКП(б), мабілізуючы масы на выкананьне канкрэтных задач сацыялістычнага будаўніцтва, узьнімаючы яшчэ большую актыўнасьць рабочае класы і калгасьнікаў, узьнімаючы на вышэйшую ступень сацыялістычнага і ўдарніцтва.

4. Беларускаму Кіраўніцтву Сувязі пад асабістую адказнасьць т.т. Дубіны і Шукевіча і Беднзяржкіно пад адказнасьць тав. Галкіна забясьпечыць шырокае скарыстаньне радыёвяшчаньня і кіно для мабілізацыі мас вакол пытаньняў, высунутых тэзісамі XVII партыйнай канфэрэнцыі. Культпропу ЦК прагледзець за якасьцю гэтай работы (папярэдні прагляд, вызначэньне і інструктаваньне дакладчыкаў і інш.).

5. Для правядзеньня дакладаў на прадпрыемствах Менску камандыраваць наступных дэлегатаў зьезду т. т. Галадзед, Кавальчук, Рыжоў, Бэнэк, Хлоўнікаў, Судакоў, Томашэўскі, Гантман, Грысевіч, Турлай, Хацкевіч, Малкін, Міцькоў, Рачыцкі, Гаруновіч, Іваноў, Рыскін, Аранштам, Гуровіч (ЦКК), Ляўкоў.

6. Ва ўсёй сетцы партыйнай асьветы (школы, гурткі, курсы) стала пра працаваць тэзісы XVII партыйнай канфэрэнцыі, Гаркомам і Райкомам забясьпечыць высокую якасьць гэтай прапрацоўкі.

7. Прапрацаваць тэзісы XVII канфэрэнцыі ў школах сацвыху па лініі выкладаньня прамадазнаўства.

8. Работа па папулярызацыі тэзісаў XVII канфэрэнцыі УсеКП(б) павінна быць шчыльна зьвязана з цыркім растлумачэньнем ходу работы XIV зьезду КП(б)Б пад кутом працягу разгортваньня сацпаборніцтва і ўдарніцтва прадпрыемстваў, саўгасаў і калгасаў і МТС на права рапартаваць зьезду, дабіваючыся выканаьня і перавыкананьня прамфінпляну, усіх відаў загатовак, рэалізацыі шасьці гістарычных умоў т. Сталіна, рашуча змагаючыся супроць правага апартунізму, галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць «левых» заібаў і прымірэнцтва да ўхілаў.

Барацьба за лён

Партарганізацыі васьмі адстаючых раёнаў

абавязаны крута ўзьняць уверх крывую лёназагатовак, выканаць баявую дырэктыву 14 зьезду КП(б)Б

Пастанова бюро ЦК КП(б)Б,

зарьверджаная XIV зьездам КП(б)Б

1. Бюро ЦК адзначае зусім незадавальняючы ход выкананьня пляну ільназагатовак (50,4 проц. на 21 студзеня 1932 году пры неабходнасьці выканаць плян да 1 сакавіка).

Асабліва адстаюць у справе выкананьня пляну ільназагатовак Асьвейскі, Дубровенскі, Горацкі, Расонскі, Чавускі, Шклоўскі, Гарадоцкі, Лёзьнянскі і інш. раёны.

Бюро ЦК ня можа прайсьці міма такога ганебнага факту, як выкананьне пляну ільназагатовак па Койданаўскім раёне ўсяго на 9,3 проц., Капыльскім —19,9 проц., Бягомльскім—26,3 пр., і Брунскім—28,6 проц.

У мэтах рашучага пералому ў справе ільназагатовак бюро ЦК лічыць неабходным правесьці наступныя мерапрыемствы:

а) камандыраваць на месцы групы дэлегатаў з ільнаводчых раёнаў, галоўным чынам з кіруючага складу гэтых раёнаў, за выключэньнем Дрысы, якая выканала 80 проц. пляну;

б) камандыраваць не пазьней 26 студзеня 15 адказных кіруючых работнікаў для мабілізацыі мясцовых арганізацый і аказаньня ім дапамогі ў справе ільназагатовак.

3. Усклясьці апэрацыйнае кіраўніцтва ходам ільназагатовак на тав. Бэнэка (нам. старшыні СНК).

Даручыць тав. Бэнэку арганізаваць штодзённую інфармацыю аб ходзе выкананьня гэтага рашэньня.

4. Партыйным арганізацыям ільнаводчых раёнаў і таварышчам, якія камандыруюцца з цэнтру, асноўным мэтадам сваёй работы лічыць мабілізацыю шырокай грамадзкасьці вакол задач, зьвязаных з ільназагатоўкамі, з прыцягненьнем да гэтай справы ўсяго актыву вёскі і калгасаў, у той-жа, самы час ні ў якім разе не дапускаць адміністраваньня і перагібаў пры ажыцьцяўленьні гэтай задачы.

5. Даручыць тав. Балціну на аснове гэтай пастановы ўстанавіць такія тэрміны выкананьня пляну ільназагатовак паасобнымі раёнамі па пяцідзённках, якія-б тарантавалі ў бліжэйшыя 10 дзён ліквідацыю адставаньня ў тэмпах загатовак з мэтай выкананьня гадавога пляну, паводле раней вызначаных канчатковых тэрмінаў

6. Гэту пастанову ўнесьці на зацьвярджэньне зьезду з наступным пунктам пастановы зьезду:

1. XIV зьезд КП(б)Б ўпэўнены, што ўсе раённыя партыйныя арганізацыі і работнікі, якія камандыруюцца зьездам, дасягнуць сапраўднага пералому ў ходзе выкананьня пляну лёназагатовак, і што ўся КП(б)Б прыдзе да XVII партыйнай канфэрэнцыі УсеКП(б) з вынікамі бальшавіцкага выкананьня бальшавіцкай задачы ва ўмовах БССР—выкананьне пляну лёназагатовак.

Прычына прарыву--адсутнасьць арганізацыі першапачатковай апрацоўкі

ПОЛАЦАК. Апрацоўка і загатоўка лёну ў радзе калгасаў Замшанскага сельсавету праходзіць бяз кіраўніцтва з боку Райкалгассаюзу.

У калгасе «Кастрычнік» ня гледзячы на тое, што ёсьць 200 працаздольных рабочых да апошняга часу ляжыць нятрапаным каля 120 цнт. сырцу. На трапаньне лёну калгас вылучае штодзень ня больш 17 чалавек, у той час, калі можна паставіць на работу ня менш 60 чалавек. У выніку такога адносін да работы плян загатоўкі па валакну калгас выканаў толькі на 33 проц.

Яшчэ горш абстаіць справа з апрацоўкай лёну ў калгасе «Земляроб». У гэтым калгасе ляжыць неабмалочаным да 20 тон лёну. Плян па лёназагатоўках выканан толькі на 12 проц. Апрацоўка лёну зусім не разгарнулася. З 29 рабочых на апрацоўку лёну выходзяць ня больш 6—10 чалавек.

У калгасе «Шлях Леніна» «апрацоўка» лёну заключаецца ў тым, што лёна - трасту па крысе возяць на Дрысенскі лёназавод.

Райкалгассаюз не праявіў апэрацыйнага кіраўніцтва апрацоўкай лёну. Ня гледзячы на пастанову Райкому КП(б)Б Райкалгассаюз не арганізаваў апрацоўку, не зняўся пытаньнем перакідкі сіл у адстаючыя калгасы для ліквідацыі прарываў па лёназагатоўках.

Для пасіленьня лёназагатовак Райком КП(б)Б накіраваў у Замшанскі сельсавет у якасьці ўпаўнаважанага намесьніка старшыні Райкалгассаюзу тав. Грашчанку. Але апошні замест практычнай дапамогі займаўся толькі гастралёрствам.

«Апэрацыйнае» кіраўніцтва лёназагатоўкамі з боку Грашчанкі выразілася ў тым, што ён зьняў з пасады старшыні некалькіх калгасаў. Замест таго, каб дапамагчы выправіць дапушчаныя памылкі, тав. Грашчанка імкнецца пераложыць усю віну на мясцовыя партыйныя арганізацыі і савецкія органы.

Неабходна прыняць рашучыя захады па перабудове работы ў справе лёназагатовак у Замшанскім с.-с. Райкалгассаюз павінен спыніць гастралёрства адказных работнікаў, а практычнай дапамогай і апэрацыйным кіраўніцтвам дапамагчы выканаць плян лёназагатовак у самы кароткі тэрмін.

Палаганкін. Л. Хома.

За ўдарную апрацоўку і загатоўку лёну--прэміі

Сенно. Рад калгасаў раёну паказалі ўдарныя тэмпы ў апрацоўцы лёну. Дзякуючы апэрацыйнаму кіраўніцтву парт'ячэек, яўхіальнага ажыцьцяўленьня шасьці ўмоў т. Сталіна поўнасьцю выканалі плян лёназагатовак калгасы: **Утрылава, Папоўка, Расходна.** Гэтыя калгасы здалі (прадалі) дзяржаве лёназалежно добрай якасьці. За выкананьне пляну па лёназагатоўках гэтая група калгасаў прэм'іравана прамтаварамі на 375 рублёў.

Таксама прэм'іраваны прамтаварамі на суму ў 375 руб. калгасы: **Чароўкі, Пурылева і Каралевічы** за здачу добраякаснага валакна.

Калёны барацьбітоў за лён павялічваюцца з кожным днём. Кандыдатамі для прэм'іраваньня за лёназагатоўкі вызначаны наступныя калгасы: **Яхімаўшчына, Ладзікава, «Трэці рашаючы», М.-Азярэйкі і Хаменькі,** якія набліжаюцца да выкананьня пляну.

Усе адстаючыя калгасы раёну павінны ўзяць прыклад з лепшых калгасаў.

Б. Зяневіч.

Рашуча ўдарыць па спажывецка-кулацкіх настроях

Бягомль. На некаторых калгасах назіраецца значнае разбазарваньне таварнай прадукцыі лёну. У калгасе імя 10-гадзьдзя пагранатраду, Брэзінскага сельсавету, пры размеркаваньні ўраджаю ніжняму калгаснику вызначылі па 0,5 цнт. лёнаваланна, у выніку чаго разбазарана некалькі цэнтнераў таварнай прадукцыі. У радзе калгасаў, якія часткова выканалі плян лёназагатовак, таксама назіраюцца спробы пакінуць частку лёну на спажывецкія патрэбы.

Райком КП(б)Б і Райкалгассаюз павінны рашуча ўдарыць па спажывецкіх настроях і разбазарваньні таварнай прадукцыі лёну.

Брыгада друку:
Сталыга, Тайгін.

Калгас „Ленінскі Шлях"--у авангардзе барацьбы за лён

Магілёў. У падарунак XIV зьезду КП(б)Б калгас «Ленінскі Шлях», Вендарскага сельсавету, поўнасьцю выканаў плян лёназагатовак.

Калгас «Ленінскі Шлях» дамогся гэтай перамогі дзякуючы ажыцьцяўленьню на практыцы шасьці ўмоў тав. Сталіна. Засеяныя 18 га лёну былі своечасова ўбраны. Калгас адразу не разлючыўся на хутчэйшую апрацоўку і здачу (продаж) лёну дзяржаве. Была створана сацыяльная ўдарная брыгада, якая ўвесь час займалася апрацоўкай лёну.

Была дэталёва распрацавана пастанова Наркамзему і Калгасцэнтру. Нормы выпрацоўкі шырока абгавораны на агульным сходзе калгаснікаў. Вось гэтыя нормы: сушыць дзьве асеці лёну на адзін працадзень, мяць--дзьве асеці ручнымі мяліцамі на 6 калгаснікаў, трапаньне 90 жмень на працадзень.

Шырока разгарнулася сацпаборніцтва і ўдарніцтва. Дзякуючы гэтаму калгас «Ленінскі Шлях» на чатыры дні раней вызначанага тэрміну скончыў апрацоўку лёну.

Лепшыя ўдарнікі—**Волька Іванова, Ганна Васільева, Параска Іванова, Аўдакім Казакоў**—пром'іраваны абуткам і мануфактурай

Калгас здаў 4½ цнт. добраякаснага валакна, 26 цнт. трасты, поўнасьцю выканан плян па здачы (продажу) сеўна.

Калгаснікі калгасу «Ленінскі Шлях» даюць абяцаньне, што з бальшавіцкай настойлівасьцю будуць праводзіць усе гаспадарча-палітычныя кампаніі, што ня з меншым посьпехам будзе праведзена падрыхтоўка да трэцяй бальшавіцкай вясны

Д. Алан.

Парафіраваньне савецка-польскага дагавору аб ненападзе

Паведамленьне ТАСС

Учора, 25 студзеня, у НКЗС народным камісарам замежных спраў тав. Літвінавым і польскім пасланьнікам у Маскве п. Патэкам парафіраваны (змацованы ініцыялямі) публікуемы ніжэй дагавор аб ненападзе паміж Саюзам ССР і Польскай рэспублікай.

Пакт аб ненападзе паміж Саюзам ССР і Польскай распублікай

«ЦВК СССР, з аднаго боку, і Прэзыдэнт Польскай Рэспублікі, з другога, кіруемыя жаданьнем захаваньня існуючага паміж іх краінамі міру і перакананыя ў тым, што захаваньне паміж імі міру зьяўляецца значным фактарам у справе захаваньня ўсеагульнага міру,

прызнаючы, што мірны дагавор ад 18-га сакавіка 1921 году зьяўляецца, як і раней, асновай іх узаемных адносін і абавязацельстваў,

будучы перакананы, што мірнае вырашэньне міжнародных спрэчак і зьніштэньне ўсяго, што супярэчыла-б нармальнаму стану адносін паміж дзяржавамі, зьяўляецца найбольш верным сродкам дасягненьня намечанай мэты,

заяўляючы, што ні адна з прынятых на сябе кожным з бакоў да сучаснага часу абавязацельстваў не пярэчыць мірнаму разьвіцьцю іх узаемных адносін і не супярэчыць гэтаму дагавору,

пастанавілі заключыць гэты дагавор з мэтай разьвіцця і дадатку дагавору, падпісанага ў Парыжы 27-га жніўня 1928 году і ўведзенага ў жыцьцё пратаколам, падпісаным у Маскве 9-га лютага 1929 году, і назначылі з гэтай мэтай сваіх упаўнаважаных, а іменна:

ЦВК СССР. . . . . .

Прэзыдэнт Польскай Рэспублікі .....

які па абмене сваімі паўнамоцтвамі, знойдзенымі ў добрым і належным выглядзе, прыйшлі да згоды аб ніжэйнаступных пастановах.

АРТЫКУЛ 1-ы. Абодвы дагаварваючыяся бакі, канстатуючы, што яны адмовіліся ад вайны як прылады нацыянальнай палітыкі ў іх узаемаадносінах, абавязваюцца ўзаемна ўстрымлівацца ад розных агрэсыўных дзеяў ці нападу адзін на аднаго, як паасобна, так і разам з іншымі дзяржавамі.

Дзеяй, якая супярэчыць абавязацельствам гэтага артыкулу, будзе прызнаны кожны акт гвалту, які парушае цэласьць і недатычнасьць тэрыторыі ці палітычную незалежнасьць іншага дагаварваючагася боку, нават калі-б гэтыя дзеі былі ажыцьцёўлены без абвешчаньня вайны і з уникненьнем усіх яе магчымых праяў.

АРТЫКУЛ 2-гі. У выпадку, калі-б адзін з дагаварваючыхся бакоў падпаў нападу з боку трэцяй дзяржавы ці групы трэціх дзяржаў, другі дагаварваючыся бок абавязваецца не аказваць ні проста, ні ўкосна, дапамогі і падтрыманьня нападаючай дзяржаве на працягу ўсяго канфлікту.

Калі адзін з дагаварваючыхся бакоў ужыве агрэсію супроць трэцяй дзяржавы, дык другі бок будзе ўправе без папярэджаньня дэнансаваць гэты дагавор.

АРТЫКУЛ 3-ці. Кожны з дагаварваючыхся бакоў абавязваецца ня прымаць удзелу ні ў якіх згодах, з агрэсыўнага пункту гледжаньня яўна варожых другому боку.

АРТЫКУЛ 4-ы. Абавязацельствы, памянёныя ў арт. арт. 1-м і 2-м гэтага дагавору, ня могуць ні ў якім выпадку абмяжаваць ці відазьмяніць міжнародныя правы і абавязацельствы, выцякаючыя з абодвых дагаварваючыхся бакоў са згодаў, заключаных імі да набыцьця моцы гэтага дагавору, паколькі гэтыя згоды не заключаюць у сябе элемэнтаў агрэсіі.

АРТЫКУЛ 5-ы. Абодвы дагаварваючыяся бакі, імкнучыся да ўладжаньня і вырашэньня, толькі пры дапамозе мірных сродкаў, усіх спрэчак і канфліктаў незалежна ад іх прыроды ці паходжаньня, якія маглі-б узьнікнуць паміж імі, абавязваюцца перадаваць спрэчныя пытаньні, у адносінах якіх у належны пэрыяд часу не магло быць дасягнута згоды дыплёматычным шляхам, на згодніцкую працэдуру, згодна пастаноў канвэнцыі з ужываньнем згодніцкай працэдуры, якая канвэнцыя складае неадымную частку гэтага дагавору і павінна быць падпісана па асобна і ратыфікавана ў магчыма хуткі тэрмін разам з дагаворам аб ненападзе.

АРТЫКУЛ 6-ы. Гэты дагавор будзе ратыфікаваны ў магчыма хуткі тэрмін і ратыфікацыйныя граматы будуць абменены ў гор. Варшаве на працягу 30 дзён з дню ратыфікаваньня СССР і Польшчай, пасьля чаго дагавор без адкладна ўвойдзе ў моц.

АРТЫКУЛ 7-ы. Дагавор заключаецца на 3 гады з тым, што, паколькі адзін з дагаварваючыхся бакоў не дэнансуе яго за 6 месяцаў да сканчэньня тэрміну, тэрмін дзеяньня дагавору лічыцца аўтаматычна прадоўжаным на наступны двухгадовы пэрыяд.

АРТЫКУЛ 8-ы. Гэты дагавор складзены на расійскай і польскай мовах і абодвы тэксты будуць лічыцца аўтэнтычнымі.

Пратакол пад ісаньня № 1

«Высокія дагаварваючыяся бакі заяўляюць, што артыкул 7-ы дагавору ад . . . . . ня можа быць тлумачаны такім чынам, што сканчэньне тэрміну ці дэнансацыя да сканчэньня тэрміну згодна артыкулу 7-га маглі-б мець вынікам абмежаваньне ці ўхіленьне ад выкананьня абавязацельстваў, выцякаючых з Парыскага дагавору 1928 году.

Пратакол падпісаньня № 2

«Падпісваючы гэтага чысла пакт аб ненападзеньні, абодвы бакі, абмяняўшыся думкамі наконт прадстаўленага савецкім бокам праекту згодніцкай канвэнцыі выказваюць перакананьне ў адсутнасьці паміж бакамі існуючых разгалосьсяў».

Заява польскага міністра замежных спраў Залескага

ВАРШАВА. 20 студзеня на паседжаньні замежнай камісіі сойму міністр замежных спраў Залескі, адказваючы на запытаньне аб ходзе перагавораў з Савецкім Саюзам, заявіў:

«Што датычыцца дагавору аб ненападзе, дык я не хацеў-бы зараз выкладаць дэтамі ў сувязі з тым, што зараз справа гэта паскораным тэмпам дыскутуецца ў Маскве.

У польска-савецкім дагаворы ня можа быць і гутаркі аб заходніх межах. Дагавор гэты мае зусім іншыя мэты. Таксама не закранаецца і віленскае пытаньне. Магу заявіць, што дагавор аб ненападзе, як мы яго разумеем, зьяўляецца нічым іншым, як пашыраным пактам Келёга. У дагаворы значна дакладней вызначаны разуменьні нападаючага боку і пытаньне аб нэйтралітэце.

Апроч таго павінен быць заключаны яшчэ дагавор аб згодніцкай працэдуры. Мы хацелі-б, каб усе спрэчныя пытаньні вырашаліся шляхам арбітражу. Аднак, з прычыны таго, што Расія гэтага не прызнае, я лічу, што кожны крок наперад у гэтым напрамку заўсёды трэба расцэньваць дадатна. Мы заключым згоду аб кансаліцыі маючы надзею, што з часам, мажліва, прыдзем да арбітражу».

Адказваючы на запытаньне пэпэсэўскага дэпутата Чапінскага, у якой стадыі знаходзіцца справа заключэньня дагавору, міністр сказаў: «Многа пунктаў ужо канчаткова гатовы, за стаецца яшчэ рэдагаваньне некаторых пытаньняў. Я спадзяюся, што гэта — справа некалькіх дзён, і дагавор у хуткім часе будзе гатовы. Затым гутарка будзе ісьці аб заключэньні кансіліацыйнай (прымірэнчай) канвэнцыі, падрыхтоўка да якой не павінна заняць цмат часу, бо я ня бачу вялікага разыходжаньня пунктаў погляду».

Аб назначэньні дэлегацыі Саюзу ССР на канфэрэнцыю па скарачэньні і абмежаваньні ўзбраеньняў ў Жэневе

Пастанова Савету Народных Камісараў Саюзу ССР

Савет Народных Камісараў Саюзу ССР пастанаўляе:

Назначыць дэлегацыю Саюзу ССР на канфэрэнцыю па скарачэньні і абмежаваньні ўзбраеньняў у Жэневе, у складзе:

Старшыні дэлегацыі—Народнага Камісара па замежных справах тав. Літвінава, Максіма Максімавіча, членаў дэлегацыі—т.т. Сакольнікава, Грыгорыя Яхаўлевіча, Луначарскага, Анатоля Васільевіча, Венцава, Сямёна Іванавіча, Ланговага, Александра Алексеевіча.

Старшыня Савету Народных Камісараў Саюзу ССР
В. Молатаў (Скрабін).

Нам. кіраўніка справамі Савету Народных Камісараў Саюзу ССР
І. Мірошнікаў.

Масква, Кремль. 25-1 1932 г.

Інтэрвью Народнага камісара замежных спраў тав. М. М. Літвінава

ТАСС зьвярнуўся да Народнага Камісара Замежных Спраў тав. Літвінава перад яго ад'ездам у Жэнэву з запытаньнем аб стане перагавораў з суседнімі Заходнімі краінамі аб заключэньні пактаў аб ненападзе.

Тав. Літвінаў паведаміў нам наступнае:

Зьмест прапануемых савецкім урадам пактаў вельмі нескладаны і заключаецца ў абавязацельствах ненападу і магчымым зьніштэньні прычын, якія маглі-б парушыць мірныя адносіны паміж заключаючымі пакт дзяржавамі. Калі пры перагаворах аб пакце абодвы бакі сапраўды натхнёны імкненьнем да ўмацаваньня мірных адносін, не баючыся мірных абавязацельстваў і не праследуючы пабочных мэтаў, тады перагаворы ўдаецца завяршыць вельмі шпарка. Прыкладам гэтаму зьяўляюцца перагаворы з Фінляндыяй, якія быў добра закончаны і завершаны падпісаньнем пакту на працягу пары тыдняў.

З Польшчай перагаворы пачаліся на некалькі тыдняў раней, чымся з Фінляндыяй, і скончыліся толькі сёньня парафіраваньнем пакту аб ненападзе, публікуемага ў друку.

З Латвіяй перагаворы пасоўваюцца наперад павольна, а Эстонія пачала іх некалькі дзён таму назад. Пасьля падпісаньня пакту з Фінляндыяй і парафіраваньня пакту з Польшчай, заключэньне пактаў з Эстоніяй і Латвіяй не павінна было-б прадстаўляць ніякіх труднасьцяй. Перагаворы з Эстоніяй і Латвіяй павінны быць палегчаны яшчэ той абставінай, што мірнымі дагаворамі з імі прадугледжаны ужо ўзаемны нэйтралітэт і што таму ў пакце можна абыйсьціся без паўтарэньня гэтага абавязацельства.

Праект пакту з Румыніяй таксама амаль пагоджаны. Абодвы бакі згадзіліся на перагаворы, выходзячы з неабходнасьці пакіданьня ў баку нявырашанага бесарабскага пытаньня. Зусім відавочна, што двубаковы пакт паміж дзьвума дзяржавамі, паміж якімі ня толькі не існуе ніякіх афіцыйных адносін, але і маюцца сур'ёзныя тэрыторыяльныя і іншыя спрэчкі, ня можа быць заключаны без спамінаньня аб незакрананьні гэтых спрэчак і аб пакіданьні іх у баку. Мы зусім разумеем, што, паколькі Румынія фактычна акупуе Бесарабію, яна хацела-б забыцца аб існуючых спрэчках і неспамінаньне аб іх, растлумачыць, як нашу маўклівую згоду на акупацыю. Мы на гэта згадзіцца ня можам. Румынія, аднак, ідзе значна далей і дабіваецца такой фармулёўкі пункту аб ненападзе з якога выцякала-б прызнаньне намі ці сувэрэнітэту Румыніі над Бесарабіяй, ці прызнаньне рэчкі Дністра ў якасьці межы Румыніі. Мы на гэта таксама ня можам згадзіцца. Павінна быць зусім ясна сказана, што абодва бакі захоўваюць свае пазіцыі ў спрэчным пытаньні і што заключэньне пакту не паносіць гэтым пазіцыям ніякай страты.

Мэтай пакту зьяўляецца зьніштэньне магчымасьці нападу аднаго боку на другі, і гэта мэта поўнасьцю дасягаецца ўжо пагодженым першым артыкулам пакту, які гаворыць: «кожны з дагаварваючыхся бакоў, канстатуючы, што ён адмовіўся ад вайны ў якасьці сродку нацыянальнай палітыкі ў сваіх адносінах абавязваецца ня ўжываць супроць другога боку ні паасобна, ні разам з іншымі дзяржавамі якога - небудзь нападу на сушы, на моры, ці ў паветры і ня ўжываць ні ў якім выпадку вайны супроць другога боку».

Больш таго, савецкі бок згадзіўся дадаць да гэтага артыкулу 2-гі абзац, устанаўляючы, што парушэньнем пакту будуць лічыцца якія-б то ні было спробы вырашэньня гвалтоўным шляхам існуючых паміж абедзьвума краінамі тэрыторыяльных і іншых спрэчак. У гэтым выглядзе пакт дае поўную гарантыю непарушэньня існуючага паміж абедзьвума краінамі становішча гвалтоўным шляхам.

Савецкі ўрад даў досыць доказаў сваёй добрай волі і шчырага імкненьня да заключэньня пактаў. Далейшае залежыць аднак, ад добрай волі другой краіны.

(ТАСС).

Фінляндзкі міністр замежных спраў аб савецка-фінляндзкім пакце ненападу

ГЕЛЬСІНГФОРС. Фінляндзкі міністр замежных спраў Ірыо Каскінен зрабіў прадстаўнікам мясцовай прэсы ў сувязі з падпісаньнем дагавору аб ненападзе паміж СССР і Фінляндыяй наступную заяву:

«Я лічыў важным у сучасны вельмі заблытаны момант эноў давесьці Савецкаму Саюзу, што Фінляндыя, як і іншыя заходнія суседзі СССР, ня мае ні малейшага намеру парушыць мір ва Ўсходняй Эўропе. Можна, зразумела, указаць, што пры такіх умовах паўторнае абавязацельства зьяўляецца непатрэбным, калі ўлічыць, што ўжо ў дэрэтоскім мірным дагаворы або двы бакі абяцалі падтрымліваць міралюбныя адносіны.

Апроч таго, мы, як і СССР, адмовіліся ад вайны, як сродку нацыянальнай палітыкі, калі падпісалі пакт Келёга. Ня гледзячы на гэта, заключаны сёньня дагавор усё-ж мае ў сучасны момант вялікае значэньне. Ён пацьвярджае ў дакумэнтальнай форме тое, з чым уся Фінляндыя, незалежна ад партыйнай прыналежнасьці, згодна.

Аднак, магчыма, што для заграніцы гэта ня зусім ясна, а іменна, што Фінляндыя, ня гледзячы на розьніцу грамадзкага ладу абедзьвюх краін, жадае разьвіваць міралюбныя адносіны з сваім вялікім усходнім суседам.

Неабходна прыняць пад увагу, што мір ва Ўсходняй Эўропе не забясьпечваецца падпісаньнем дагавору аб ненападзе толькі паміж Фінляндыяй і СССР.

Для дасягненьня гэтай мэты важна, каб такія-ж дагаворы былі заключаны таксама паміж СССР і іншымі яго заходнімі суседзямі». «У сувязі з гэтым, — заключае міністр, — я лічыў неабходным паведаміць тутэйшаму пасланьніку ў СССР, што ратыфікацыя дагавору Фінляндыяй залежыць ад таго, ці будуць падобныя дагаворы заключаны таксама паміж СССР і іншымі яго заходнімі суседзямі».

Францыя выкарыстоўвае Манчжурскі вопыт

ПАРЫЖ, 26 студзеня. (ТАСС). «Юманітэ» заклікае працоўных Францыі да пільнасьці, адзначаючы, што «Францускі імпэрыялізм стварае ў паўднёвых правінцыях Кітаю васальны ўрад пад кіраўніцтвам генэрала Чжэ Цэі-цяна для таго, каб палегчыць сабе захоп Юнаня і іншых правінцый Паўднёвага Кітаю».

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ЦК УсеКП(б) з глыбокім жалем паведамляе аб сьмерці

тав. П. СТУЧКА

старэйшага бальшавіка, актыўнага дзеяча нашай партыі і Камінтэрну, рэалізацыйна а барацьбіта за аслабаньне рабочае класы.

Гук. кіно тэатр **„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"** Каса з 1 г дня
Новы гукавы і газар. мастацкі фільм вытв. Ленінгр. фабрыкі Саюзкіно **СНАЙПЭР** Пач. 4-30 6, 7-30, 9 10-30.

КІНО **„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"** Каса ад 12 г
ХТО ТЫ ТАКІ? У галоўнай ролі Кторaў і Суданевіч Пач 2, 3 30. 6 7-30, 9, і 10

КІНО **„ПРАЛЕТАРЫ"**
„Рабочая жанчына" Пач. а 2 гадз. дня

КОШТ публікацыі аб згубе дакумэнту **1 руб.**

Цэнтральны Камітэт Т-ва Чырвонага Крыжу БССР
(Менск, Першамайская, 7)
ШУКАЕ наступных грамадзян,
якім належыць спадчына пасьля памершых у Амэрыцы родных:
Астроўскіх Яава, Саламона, Хаю і іх дзяцей.
Барана Самуіла — баньку Барана Міхаса.
Лёўчук Мірфу — жонку Лёўчука Івана.
Хэйфец Алеся Івашава (артыстага)—розьніча Іоффэ Эльці Шабшэлеўны—спадчына з Нямеччыны.

ПАЧАТАК ЗАНЯТКАЎ на завочным сэктары Палітасьветнага Інстытуту адбудзецца **1 лютага 1932 г.**
Прыём заяў працягваецца
Адміністрацыя

УКРАДЗЕНЫ квіт № 227 „Торгсина" на імя Стацкевіча С К. на прынятае золата-лом, лічыць несапраўдным

УКРАДЗЕНЫ бумажнік з дакумантамі на імя Гуцько, У. Я., выдзеныя за выключэньнем рэдакцыйнага пасьведчаньня, да 32 г дакумэнты лічыць несапраўднымі.

ПАКРАДЗЕНЫ ордэр на заказу № 1181 ад 16-га студзеня для атрыманьня тавару з магазыну Торгсіну на імя Люсіна І. Х., лічыць несапраўдным

ЗГУБЛЕНЫ праязны білет Менск—Калодзішча, № 256856, на імя Аносіна лічыць несапраўдным

ДЗЯРЖБАНК
ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА НАСЕЛЬНІЦТВА,
ШТО ТЭРМІН ПРАДСТАЎЛЕНЬНЯ ПОЛІСАЎ СТРАХАВОГА ВОБЧЭСТВА „Нью-Іорк"
ПРАЦЯГНУТ да 1-га красавіка 1932 г.
ПОЛІСЫ ПРЫМАЕ ДЗЯРЖБАНК І ЎСЕ АШЧАДКАСЫ
Правстаўленьне самога полісу неабавязкова, калі гэткага няма, дастаткова ўказаць яго нумар, імя і прозьвішча застрахованага, страхаваную суму, прыблізна дату страхаваньня, точнае месца страхаваньня, калі нумар невядомы, дастаткова апошнія даныя
ЗА ЎСІМІ ДАВЕДКАМІ ТРЭБА ЗВАРОЧВАЦЦА **Ў ЗАМЕЖНЫ АДДЗЕЛ ДЗЯРЖБАНКУ**
Усебеларуская Кантора Дзяржбанку

28 студзеня а 12 гадзіне дня ў агульнай залі БАН (Ленінская, 29-35, другі паверх)
АДБУДЗЕЦЦА ПЛЕНУМ АКАДЭМІЧНАГА САВЕТУ БЕЛАРУСКАЙ АКАДЭМІІ НАВУК
ПАВЕСТКА ДНЯ
1. Разгляд і зацьвярджэньне плянаў працы інстытутаў акадэміі на 1932 г.
2. Аб масавай працы Акадэміі.
3. Разгляд і зацьвярджэньне сапумовы паміж акадэміяй СССР.
Кіраўніцтва справаў БАН

ЗГУБЛЕНЫ:
Ваінскі білет, выд. Горацк. ваенкам. і паявая кніжка выд. Горацк. спаж. т-вам, Панкрацкага Д. С., кв. 1529-п.
Членскі білет № 71156, выд. профкам. акадэміі, Вінакура Г. М., кв. 1529-п.
Ваінскі білет, выд. Ліхачоўск. сельсав., Фаружэнка П. А., кв. 1529-п.
Камсамольскі білет, выд. Аршанск. РКЛСМ, Загарэльскага А. Я., кв. 1529-п.
Лекавая картка, выд. Горацк. сампрамсаюз., Касьянова К. Ф., кв. 1529-п.
Конская картка 1857, выд. Гарадзецк. сельсав., Казакова М. Ф., кв. 1529-п.
Конская картка № 470 на кабылу цёмна-шэр. масьці 3 катэг., Васорава С. Е., кв. 1529-п.
Паязная кніжка № 100, выд. Паршынок. с.-с. і членскі білет № 117304, выд. Горацк. Рабземлес., Таўкачэнка Г. С., кв. 1529-п.
Ваінск. кніжка, выд. Горацк. ваенкамат., Бамкова П. Г., кв. 1529-п.
Ваінск. кніжка, выд. Горацк. ваенкамат., пасьвед., выд. Горацк. лесправгасам, і расьпіска н 500 руб. 94 коп., выд. Горацк. лесрабкопам, Жэўлакова Т. С. кв. 1529-п.
Прамтаварн. квіт., выд. Горацк. малочн. арцельпо, Гапонава Д. К., кв. 1529-п.
Студ. пасьвед., выд. канц. інстыт., і паявая кніжка на імя Шмурэдова Д. В., выд. Горацк. гарпо, кв. 1529-п.
Праф. білет № 5556, выд. Сагаленск. губ. аддз. мэдсанпрацы, Селеўцова С. В., кв. 1529-п.
Даведка Хоцькова І., кв. 1529-п.
Вайсковая кніжка Міжучына Н. К., выд. Горацкім ваенкаматам., кв. № 1403-п.
Прыёмны квіт на здадзеную карову Скародненскаму малочнаму таварыству, Кашэла І. К., кв. 1404-п.
Мэдычная зьпіска Гайрыленка А. А., даведка аб сацыяльным становішчы, даведка выд. калгасам «Чырвоны касцярнік», даведка выд. Ветрынскім сельсаветам, кв. 1405-п.

Друкарня імя Сталіна. Упаўнаваж. Галоўлітбел. № А—53.